ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 127 (4379)
СЕРАДА, 8 чэрвеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

СЭРЭДНЯЯ НУМАРА

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Максымальна ўшчыльніць тэрміны сяўбы тэхкультур і пераключыцца на поліва. ПРАНЧ — Аб рабоце калгаснай ячэйкі (2 стар.); Н. ЦЯРЭНЦЬЦЕЎ — Урад кампрамісу ў Японіі (3 стар.).

АБ ІЛЬГОТАХ ПАСЕЎШЧЫКАМ КАНАПЕЛЬ — Пастанова Саўнаркому СССР (1 стар.).

АБ ФАКТАХ НЕВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАНОЎ ЦК КП(б)Б АБ РАБОТНІКАХ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ — Пастанова ЦК КП(б)Б (3 стар.).

Рэдакцыям гарадзкіх і раённых газэт БССР — ліст культпропу ЦК КП(б)Б (2 стар.).

Масавай праверкай выявіць прыгодныя землі, мабілізаваць унутраныя рэсурсы, перакрыць пасеўныя пляны (1 стар.).

Мільёнамі пазыкі «4-га заключнага» забяспечым пабудову новых гігантаў індустрыі (3 стар.).

Больш масавай, арганізацыйнай работы ў разгортваньні калгаснага гандлю (3 стар.).

Рэзалюцыя пратэсту студэнтаў Камвузу супроць ліквідацыі ТБШ і беларускага школьніцтва. Адзіны чырвоны фронт супроць фашызму — з адказы ЦК германскай кампартыі (4 стар.).

Максымальна ўшчыльніць тэрміны сяўбы тэхкультур і пераключыцца на поліва

Ход сяўбы тэхкультур па БССР трэба прызнаць нездавальняючым, хаад тэмпы сяўбы ў гэтым годзе некалькі вышэй летаніх. На 1 чэрвеня засеяна (ільну і канапель) 136.675 га, або 37,3 проц. У мінулым годзе было засеяна 91.387 га або 32,4 проц. У той час, як плян пасеву ўсяго яравога кліну выканан на 52,9 проц.

Ільнаводчыя раёны мелі і маюць усе ўмовы для таго, каб сяўбу тэхкультур не запазніць. Получаюць 22 ільнаводчых МТС зьяўляюцца лепшым доказам гэтага. Прычынай адставаньня сяўбы ільну ў параўнаньні з іншымі культурамі зьяўляецца паўтароньне летаніняй пражыні, якая месца месца ў радзе раёнаў. Да гэтага часу рад ільнаводчых раёнаў ня ўсвоіў значэньня раньняй сяўбы тэхкультур, асабліва ільну. Дзе-ні-дзе ўсё яшчэ прытрымліваюцца традыцыі сеяць лён у тры пэрыяды. У выніку, як у мінулым годзе, так і сёлета пераважная частка ільну будзе засеяна ў другі і трэці — позьнія пэрыяды. Усё гэта робіцца ў процілегласьць простым указаньням партыі і ўраду аб необходнасьці правядзеньня пасеваў ільну ня менш 75 проц. раньняй сяўбы. Расцягваньне тэрмінаў нельга інакш кваліфікаваць, як простую недаацэнку раньняй сяўбы ільну.

Аб гэтым лепш за ўсё сьведчаць лічбы. Так, Гарадоцкі раён на 1 чэрвеня выканаў плян на 37,3 проц., Асьвейскі — на 25 проц., Дрысенскі — 30,7 проц., Чашніцкі — 18,3 проц., Віцебскі — 2,2 проц., Сураскі — 17,2 проц., Вушацкі — 15,8 проц.

На лепшы малюнак можна наглядаць і па некаторых ільнаводчых МТС, якія, здавалася-б, павінны былі паказаць узоры ўдарнай работы за тэхкультуры. У сапраўднасьці мы маем зусім адваротнае. Расонская МТС выканала плян на 6,5 проц., Балыніцкая — на 3,6 проц., Бешанковіцкая — 6,4 проц., Лепельская — 15,1 проц., Гарадоцкая — 19 проц. і Чашніцкая — 20,1 проц.

Няма належнай работы і па арганізацыі сяўбы тэхкультур сярод бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аднаасобнікаў. У той час, як калгасы выканалі на 42,2 проц. (па ільну), аднаасобнікі на 37,9 проц. Гэтай «лявацкай» недаацэнцы аднаасобнага сэктару павінен быць пакладзен рашучы канец.

Зацяжку сяўбы тэхкультур інакш разглядаць нельга, як жаданьне скараціць пасеўныя плошчы пад працаёмкімі культурамі. Сакратар ЦК КП(б)Б тав. Іваноў у сёпешняй тэлеграме паведамляе, што ў Гарадоцкім, Бешанковіцкім і Сіроцінскім раёнах рад калгасаў адмаўляюцца ад пасеву ільну і замяняюць яго іншымі культурамі. Трэба весьці больш рашучую барацьбу з кулаком, які агітуе супроць пасеву ільну, распальвае спажывецкія настроі сярод адсталай часткі калгаснікаў.

Побач з фактамі недаацэнкі раньняй сяўбы, сёлета мы дабіліся значных посьпехаў. Рад перадавых раёнаў калгасаў, саўгасаў і МТС перамаглі традыцыі мінулага і паказалі ўзоры барацьбы за тэхкультуры. На 1-га чэрвеня скончылі сяўбу ільну і значна пашырылі пасеўныя плошчы ў параўнаньні з мінулым годам наступныя раёны: Жыткавіцкі — 115,5 проц., Тураўскі — 122,9 проц., Пагарыцкі — 106,5 проц., Любаньскі — 102,5 проц. Завяршаюць сяўбу «Чырвона-Слабодзкі — 94,9 проц., Старобінскі — 91,1 проц., Глускі — 82,6 проц. Таксама скончылі сяўбу ільну Пёзьнянская МТС, якая выканала плян на 109,9 проц., Жыткавіцкая — 113 проц. Завяршаюць сяўбу: Мсьціслаўская МТС — 79,9 проц., Танежыцкая — 78,5 проц.

Ільну засталося засеяць 186.000 га, або 59,1 проц. ільнянога кліну, канапель 41.822 га, 83,6 проц. Таму перад ільнаводчымі раёнамі паўстае простая задача, калі яны сапраўды па-бальшавіцку жадаюць змагацца за высокі ўраджай тэхкультур, яны павінны максымальна ўшчыльніць тэрміны і астатнія плошчы засеяць у максымальна кароткі тэрмін.

Толькі сапраўды канкрэтнае і апэрацыйнае кіраўніцтва, дапамога калгасам, саўгасам і сапраўднае ажыцьцяўленьне на справе шасьці ўмоў т. Сталіна і арганізацыя сяўбы ў аднаасобным сэктары забясьпечыць перамогу на фронце сяўбы тэхкультур.

Адказнасьць ільнаводчых раёнаў і калгасаў яшчэ больш павялічваецца ў сувязі з апошнімі настановамі партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю. Палепшэньне матар'яльна-бытавога становішча рабочай клясы, калгаснікаў і працоўнага сялянства, задачы разгортваньня тавараазароту патрабуюць забясьпячэньня лёгкай прамысловасьці сырцом. Лён зьяўляецца каштоўнейшай тэхнічнай культурай і адным з важнейшых відаў сырцу ў справе павялічэньня выпуску і паляпшэньня снабжэньня тканінай працоўнага насельніцтва краіны.

У барацьбе за выкананьне гэтых задач партарганізацыі Беларусі павінны быць у ліку перадавікоў усяго Савецкага саюзу. Змагацца ня толькі за поўнае выкананьне і перавыкананьне пасеўных пляноў, але і абгрунтаваць максымальна высокі ўраджай тэхкультур — такавы задачы сёньняшняга дня.

Сьлядам за скарачэньнем сяўбы неабходна разгарнуць поліва. Згодна ўказаньня НКЗБ, пасевы ільну, павінны быць праполаты ня менш двух раз, працяжнасьць праполкі павінна быць ня больш 10 дзён. Праполачная кампанія зьяўляецца важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніяй. Ад пасьпяховасьці правядзеньня яе і догляду за пасевамі будзе залежыць таварны выхад прадукцыі. Наяўнасьць і завоз значнай колькасьці ільна-церабілак аблягчае ўборачныя работы. Але мэханізацыя ўборкі патрабуе культурных пасеваў ільну. Засьлечанасьць палёў значна пагіршае ўраджайнасьць, якасьць валакна і затрудняе ўборку. Ня трацячы ні адной хвіліны, на мясцох павінна быць разгорнута шырокая работа з тым, каб ні аднаго гэктару тэхкультур не засталося не праполатым.

Згодна тых-жа ўказаньняў НКЗБ, праполку неабходна пачынаць на 15-20 дзень пасьля пасеву. Да 20 мая па БССР было засеяна 24.162 га ільну. Такім чынам, мы маем частку ільну, які трэба палоць. Між тым, на мясцох усё яшчэ мала думаюць аб арганізацыі поліва.

Практыка перадавых раёнаў калгасаў у пэрыяд пасеўнай паказала, што посьпех можа быць забясьпечан пры ўмове ўпартай работы над арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньнем калгасаў, на аснове правільнай арганізацыі працы і брыгад. Неабходна зараз-жа выправіць усе дапушчаныя памылкі пры арганізацыі пастаянных пальводчых брыгад, ліквідаваць абязьлічку і ўраўнілаўку ў калгасах, саўгасах і МТС і мабілізаваць шырокія масы бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў вакол чарговых задач.

Цэнтр цяжару ў барацьбе за своячасовы пасеў, поліва і ўборку неабходна перанесьці ў брыгаду. Трэба дабіцца таго, каб для ўсіх калгасаў стала правілам, што за правядзеньне ўсіх агра-тэхнічных мерапрыемстваў адказным зьяўляецца брыгадзір. Ужо зараз-жа неабходна дапамагчы брыгадам скласьці рабочыя пляны на ўвесь пэрыяд праполачнай і ўборачнай кампаній.

Задача ўсіх ільнаводчых раёнаў, калгасаў, МТС, саўгасаў — разгарнуць шырокую масавую работу па папулярызацыі апошніх пастаноў ЦК і СНК аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках, калгасным гандлі і с.-г. падатку, давесьці іх да працоўных мас вёскі і дабіцца поўнага выкананьня пасеўных пляноў і распачаць падрыхтоўку да ўборкі.

Партарганізацыі таксама павінны разгарнуць шырокую работу па папулярызацыі апошняй пастановы СНК СССР ад 6 мая аб ільготах, якія прадастаўляюцца пасеўшчыкам канапель.

Толькі на аснове правільнай арганізацыі працы, у рашучай барацьбе з апартуністычнымі элемэнтамі, якія вядуць работу па скарачэньні пасеўных пляноў, БССР будзе ў першых радох барацьбітоў за вырашэньне праблемы тэхкультур.

АБ ІЛЬГОТАХ ПАСЕЎШЧЫКАМ КАНАПЕЛЬ

МАСКВА, 6-VI. Саўнаркам СССР за подпісам тав. Молатава (Скрабіна) вынес пастанову аб ільготах пасеўшчыкам канапель.

УСТАНАЎЛЯЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ІЛЬГОТЫ ПАСЕЎШЧЫКАМ КАНАПЕЛЬ:

1) увесь ураджай плоскані, выбраны калгаснікамі і аднаасобнікамі, не кантрактуецца, а паступае поўнасьцю ў іх непасрэднае распараджэньне. У сувязі з гэтым зьмяншаюцца ўстаноўленыя кантрактацыйнымі дагаворамі абавязацельствы калгасаў і аднаасобнікаў аб здачы валакна і насеньня канапель на 30 проц.

2) Мясцовыя органы ўлады абавязваюцца прадставіць калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам, выканаўчым спас абавязацельствы аб здачы ўстаноўленай дзяржаўным планам колькасьці валакна і насеньня канапель, поўную магчымасьць на поглад пасеўшчыкаў пераапрацоўваць насеньне канапель і канаплянную валаку на дзяржаўных, кааператыўных і саматужных прадпрыемствах, а таксама ў сябе ў гаспадарках.

3) Крайвыканкомы СЯРЭДНЯЙ ВОЛГІ, ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ, ЦЧВ, КІЕЎСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ, УССР, МАСКОЎСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ, НІЖЭГАРОДЗКАГА КРАЮ, СНК БССР І ТАТАРЫІ павінны забясьпечыць неадкладнае выкананьне ўстаноўленага пастановай СПА ад 14 лютага 1932 г. вызваленьне ад збожжазагатовак тых раёнаў і калгасаў, якія засеюць ня менш 5-7 проц. агульнай пасеўнай плошчы канапляй. У сувязі з гэтым:

а) адмяняецца кантрактацыя збажжавых культур у раёнах, прадбачаных пунктам 13 разьдзелу «г» пастановы СПА ад 14 лютага 1932 г.

б) Крайвыканкомам, вобласьвыканкомам, саўнаркомам рэспублік прапануецца апублікаваць пералік канапляводчых раёнаў, на якія распаўсюджваюцца ільготы па здачы (продажу) хлеба.

КОЖНЫ ГЭКТАР ПАСЕЎПЛОШЧЫ—НА УЛІК

МАСАВАЙ ПРАВЕРКАЙ ВЫЯВІЦЬ ПРЫГОДНЫЯ ЗЕМЛІ, МАБІЛІЗАВАЦЬ УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ, ПЕРАКРЫЦЬ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ

Ліквідаваць адставаньне МТС—абавязак усёй савецкай грамадзкасьці, кожнага камсамольца

Віцебшчына чацьвертую пяціднёўку ня зыходзіць з чорнай дошкі

ВІЦЕБСК (Наш. кар.). Уже мінула чацьвертая пяціднёўка, як Віцебшчына ня зыходзіць з чорнай дошкі. Ня гледзячы на рад прынятых раённымі арганізацыямі мер, катэгарычныя дырэктывы гаркому партыі і гарсавету, дадатковую пасылку людзей і г. д., у ходзе сяўбы не дасягнута патрэбнага пералому. Дырэктывы партыі і ўраду аб своячасовым сканчэньні сяўбы ня выкананы. На 1 чэрвеня плян выканан толькі на 40 проц. Калгасы выканалі плян на 39 проц., аднаасобны сэктар—на 43 проц. Такімі-ж тэмпамі ідзе сяўба ў прыгарадных гаспадарках і саўгасах. Першыя выканалі плян на 38 проц., а саўгасы—на 51 проц.

Адсутнасьць канкрэтнай і апэрацыйнай работы ў часе падрыхтоўкі да сяўбы і ў першыя дні палявых работ—вось аспоўныя прычыны таго, што раён увесь час плянцецца ў хвасьце пасеўнай. Ігнараваньне работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, адсутнасьць кантролю па выкананьні дырэктыў аб арганізацыі працы ў калгасах і саўгасах, слабая масавая работа сярод бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, «лявацкая» недаацэнка конскай цягавай сілы і зараз усё яшчэ тармозяць пасьпяховае правядзеньне сяўбы.

Так, у калгасе «Чырвоная армія», Ялагінскага сельсавету, сяўбу тармозяць галоўным чынам барбарскія адносіны да конскай цягавай сілы. У адносінах да каня тут панае поўная абязьлічка. Калгаснікі бяруць коняй і карыстаюцца імі як хто хоча. Зьдзелыпчына адсутнічае. На работу выходзіць калі каму ўздумаецца, у той жа час працадні запісваюцца ўсім аднолькава. У рэзультаце расхлябанай працоўнай дысцыпліны, калгас «Новы шлях», які поўнасьцю забясьпечан рабочай і цягавай сілай і насеньнем, да гэтага часу ня скончыў ворыва.

Яшчэ горшыя адносіны да конскай цягавай сілы можна наглядаць па Старасельскім сельсавеце. У рэзультаце барбарскіх адносін, у калгасе «Свабода» вывялі са строю племянную кабылу. У калгасе «Шлях сацыялізму» 10 коняй у разгар пасеўнай кампаніі былі прададзены аднаасобнікам. У калгасах «Бальшавік» і «Іскра» коні абязьлічаны і не прымацаваны да калгаснікаў. У калгасе «Чырвоны ўсход», Міхалеўскага сельсавету, коні зморана і ходзяць са зьбітымі плячыма. Тут пасьля дзённай працы коням не даюць адпачынку. Поччу іх скарыстоўваюць для апрацоўкі гародаў калгаснікаў. Конюх гэтага калгасу Нікіценка Лявон пасучы коняй на балоце 23 мая ўтапіў самага лепшага каня рысістай пароды коштам у 3.000 руб. Між тым праўленьне калгасу абмежавалася складаньнем акту і не прыцягнула Нікіценку да адказнасьці.

Узорам ганебных адносін да арганізацыі працы можа служыць калгас імя 1-га мая, Віцебскага сельсавету. Тут брыгады прымацаваны да вытворчых вучасткаў фармальна, а фактычна яны працуюць, дзе папала. Брыгадзіры не адчуваюць ніякай адказнасьці за свае вучасткі. Такое-ж становішча наглядаецца і ў калгасах Машканскага сельсавету, дзе плян выканан толькі на 32 проц. Калгас «Пяцігодка за чатыры гады» толькі зараз прыступіў да масавай сяўбы. З 23 калгаснікаў на работу выходзіць ня больш 6-9 чалавек. Мінэральнае ўгнаеньне і гной яшчэ ня вывезены, на сеньне не адсартавана і не пратручана.

Такіх ганебных фактаў, якія перашкаджаюць пасьпяховаму правядзеньню сяўбы можна прывесьці шмат. Аднак, парт'ячэйкі, старшыні сельсаветаў і калгасаў ня прымаюць рашучых мер да іх зьнішчэньня.

Выкананьне рад мерапрыемстваў па арганізацыі працоўнай дапамогі з боку гораду і ўзмацненьні работы парт'ячэек гарком не завастрыў увагі партарганізацый на такіх пытаньнях, як барацьба з абязьлічкай, ураўнілаўкай, барбарскімі адносінамі да конскай цягавай сілы.

Задача Віцебскай арганізацыі—скан цэнтраваць зараз усю ўвагу працоўнай грамадзкасьці вёскі і кінуць усе сілы раёну на ўзмацненьне работы па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Неадкладна выправіць памылкі, якія былі дапушчаны ў асобных калгасах пры арганізацыі брыгад. Павесьці рашучую барацьбу з «лявацкай» недаацэнкай цягавай сілы.

Віцебшчына мае ўсе ўмовы, каб поўнасьцю ў бліжэйшыя дні скончыць пасеўную кампанію. Для гэтага трэба значна ўзмацніць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой па ўсіх сэктарох, рашуча змагацца з апартуністычнымі элемэнтамі, якія неда ацэньваюць арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і не жадаюць змагацца за поўнае выкананьне пасеўных пляноў як калгасамі, саўгасамі, так і бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі аднаасобнікаў.

Арк. Зарубежны.

Вынікі халоднага самазаспакаеньня

КРЫЧАЎ. (Наш кар.).

У падрыхтоўцы да сяўбы Крычаўскі раён па праву займаў адно з першых месц у БССР. Іменна тут былі найбольш пэўна і масава з вялікім эфэктам выкарыстаны такія мерапрыемствы і формы, як аблігацыі насеннай пазыкі, бюлетэні, грамадзкія буксіры, шотдзенныя штурмоўкі і г. д., што было і адзначана ў пастанове ЦК КП(б)Б яшчэ ў красавіку.

Раён быў забясьпечан у патрэбнай меры насеньнем, цягавай сілай, штучным угнаеньнем і ўсім неабходным. Былі ўсе ўмовы, каб сяўбу скончыць не пазьней апошніх дзён мая. Да гэтага яшчэ больш абавязвалі раён і стала самаабавязацельствы па раньніх тэрмінах і высокай якасьці сяўбы, якія былі прыняты на красавіцкім раённым зьлёце калгаснікаў-ударнікаў.

Ня вытрыманы вызначаныя тэрміны, не ажыцьцёўлены ўзятыя самаабавязацельствы. На 31-га мая па раёне пасеўны плян выканан: калгасамі засеяна 9.386 га, або 62 проц., па аднаасобным сэктары — 3.870 га, або 65 проц. Наперадзе ідуць: Крычаўскі гарсавет — адсеяўся на 72 проц., Палапіцкі сельсавет — 71,7 проц., Капанскі сельсавет — 66,6 проц.

Ганебна здалі тэмпы і цягнуцца ў хвасьце ў мінулым перадавыя Бацьвінаўскі сельсавет — на 31 мая выканаў толькі 50,8 проц. пасеўнага пляну, Бельскі сельсавет — 52 проц. і Зарубецкі — 52,3 проц.

Прычыны адставаньня раёну з усёй глыбінёй і яркай відавочнасьцю ўскрываюцца на прыкладзе з Бацьвінаўскім сельсаветам. За ўдарную падрыхтоўку да бальшавіцкай сяўбы, за шырокую масавую работу і аказаную буксірную дапамогу адстаючым сельсаветам, Бацьвінаўка атрымала ў свой час першую ганаровую прэмію — пераходны сьцяг райкому партыі. А ўжо першага чэрвеня Бацьвінаўка атрымала другую «ўзнагароду» зусім не пачэснага характару — «пераходны рагожны сьцяг ганебна адстаючых». Падзеньне надзвычай вялікае і зусім нечакане. У чым корань зла? А ў тым, што Бацьвінаўская партыйная ячэйка і сельсавет пасьля першых перамог і посьпехаў супакоіліся, далейшую работу па непасрэднай арганізацыі сяўбы падмянілі апартуністычным самацёкам. Атрымалася нешта, накшталт, «галавакружэньня ад посьпехаў», пра ганебныя вынікі якога «Зьвязда» папярэджвала Бацьвінаўку.

Раённыя арганізацыі дапусьцілі памылку ў тым, што выпусьцілі з-пад сваёй увагі і апэрацыйнага кіраўніцтва тыя сельскія саветы, дзе ход падрыхтоўкі абяцаў найбольшыя посьпехі самой сяўбы. Цяпер гэта памылка па-бальшавіцку выпраўляецца. У Бацьвінаўку выехалі адказныя раённыя работнікі, вакол апошніх пастаноў партыі і ўраду праведзена масавая работа. Калгаснікі мабілізаваны на ліквідацыю адставаньня.

У барацьбе за бальшавіцкія тэмпы і бальшавіцкую якасьць сяўбы паказала найлепшыя ўзоры работы Крычаўская раённая газэта «Сацыялістычны шлях». 18-га мая газэта ўзнагародзіла самы адстаючы ў той час Касьцюшкаўскі сельсавет «рагожным сьцягам ганьбы». Сіла ганебнай «узнагароды» аказалася вельмі вялікай. Дзьве пяціднёўкі ўдарнай работы на пасеўным фронце прынесьлі касьцюшкаўцам перамогу. На 30 мая па сельсавеце было засеяна 60 проц. яравога кліну. Касьцюшкаўскі сельсавет зьняў з сябе пляму ганьбы, а лепшыя ўдарнікі калгасаў сельсавету па даручэньні рэдакцыі газэты і раённых арганізацый перавезьлі і перадалі сьцяг Баеўскаму сельсавету, які апынуўся ў хвасьце. Баеўцы, па прыкладу касьцюшкаўцаў, за пяціднёўку адваявалі права ня трымаць больш ганебнай «узнагароды», выйшлі на пярэднія месцы, вырасьлі да 61,2 проц. Цяпер апэрацыйны сьцяг — ганебны «ордэн адстаючых» прысуджан бацьвінаўцам, якім дана права апраўдацца ўдарным сканчэньнем сяўбы да 5-га чэрвеня — да канца дэкадніка штурму.

Шырока-разгорнутая апэрацыйная работа «Сацыялістычнага шляху», пераходны «сьцяг адстаючых» і вызначэньне рэдакцыі на адстаючыя вучасткі адыгралі вялізарную ролю ў барацьбе за павялічаньне тэмпаў сяўбы.

Зьм. Паваротны.

* * *

За апошнюю пяціднёўку—з 31 мая па 5 чэрвеня—Крычаўскі раён значна ўзмацніў тэмпы сяўбы. Нарастаньне асабліва прыкметна па адстаючых сельсаветах і калгасах. Калі, напрыклад, калгас «Бязбожнік», Бацьвінаўскага сельсавету, на 3 чэрвеня — на дзень уручэньня яму рагожнага сьцягу —меў толькі 43 проц., дык ужо на 5 чэрвеня, у выніку ўдарнай работы, ім пасеўны плян ВЫКАНАН НА 70 ПРОЦ. Па раёне-ж у цэлым на 5 чэрвеня ўключна засеяна 80 проц.

Па ініцыятыве перадавых калгасаў Крычаўскі раён бярэ на грамадзкі буксір Прапойшчыну, якая за ганебнае адставаньне ў сяўбе занесена «Зьвяздой» на чорную дошку.

Зьм. П.

Камуна „Прагрэс" і калгас „Інтэрнацыянал" перавыканалі пляны сяўбы ільну

ЛЕЗНА. (Наш кар.).

Камуна «Прагрэс», Глоданскага сельсавету, і эстонскі нацыянальны калгас «Інтэрнацыянал», Горбаўскага сельсавету, скончылі сяўбу ільну.

Камуна «Прагрэс» засеяла 143 гэкт. замест 128 га, вызначаных плянам, або 111 проц. Калгас «Інтэрнацыянал» засеяў 195 гэкт., або 106 проц. вызначаных плянам. Сяўба ільну працягваецца. Скончана таксама сяўба астатніх яравых культур.

Два буйнейшых у раёне калгасы «Прагрэс» і «Інтэрнацыянал» за ўдарныя тэмпы работы, за выкананьне і перавыкананьне пляну сяўбы ільну ў тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам, неадкладна павінны быць прэміраваны.

Гарадокская камсамолія ўключылася ў дэкадзік штурму

ГАРАДОК. Райкомам ЛКСМБ шырока разгорнута работа па правядзеньні штурмавога дэкадніка дапамогі МТС. Мабілізаваны камсамольскі актыў, які выехаў на вытворчыя вучасткі МТС і будзе там працаваць да скарачэньня сяўбы. Выехаўшыя прымацаваны да трактарных брыгад, атрадаў і разгарнулі работу па папулярызацыі апошніх пастаноў ЦК і СНК і значэньні дэкадніка штурму пасеўнай.

У дэкадзік штурму таксама ўключылася і райгазэта. Арганізуецца выданьне бюлетэняў.

Райкомам ЛКСМБ прыняты меры па арганізацыі камсамольскай ячэйкі пры МТС.

Камсамольская арганізацыя ўзяла на сябе абавязак дапамагчы МТС і скончыць сяўбу ў бліжэйшыя 3-4 дні.

Хомчанка і Взнэль.

Брыгадзір брыгады пасеўшчыкаў саўгасу «Івань» (Слуцкі раён)—т. Шкляроўскі — лепшы ўдарнік. Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам саўгасу ўзьнята пытаньне аб узнагародзе тав. Шкляроўскага ордэнам працоўнага сьцягу

УСІМ ГАРКОМАМ І РАЙКОМАМ КП(б)Б, РВК, УПАЎНАВАЖАНЫМ ЦК КП(б)Б

У мэтах забясьпячэньня поўнага выкананьня пляну сяўбы, а таксама вытуленьня магчымасьцяй пасобных раёнаў, калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў і аднаасобных гаспадарак на дадатковым засеве плошчаў зьвыш устаноўленага пляну і праверкі ўжо фактычна засеянай плошчы, ЦК і СНК прапануюць:

1. Правесьці ў пэрыяд паміж 8 і 10 чэрвеня ўключна масавую грамадзкую праверку фактычнага засеву плошчаў.

2. Для праверкі ўжо засеянай фактычна плошчы і выяўленьня вольнай, нескарыстанай плошчы ў кожным калгасе, саўгасе, вёсцы вылучаецца спэцыяльная тройка, якая на працягу трохдзеньніка праводзіць рознымі спосабамі праверку, у тым ліку шляхам абходу засеяных і незасеяных плошчаў калгасаў, саўгасаў і асмельных надзелаў гаспадарак аднаасобнікаў.

3. Праверачная тройка ствараецца ў наступным складзе:

а) у калгасе—старшыня калгасу, прадстаўнік партыйнай і камсамольскай ячэек, дзе гэткія ёсьць, і прадстаўнік сельсавету;

б) у саўгасе—дырэктар саўгасу, прадстаўнік партыйнай і камсамольскай ячэек, дзе гэткія ёсьць, і ўпаўнаважаны раёну;

в) на вёсцы—прадстаўнік сельсавету, прадстаўнік партыйнай і камсамольскай ячэек, дзе гэткія ёсьць, і ўпаўнаважаны раёну;

4. У праверачныя тройкі ўключаюцца аграномы і каморнікі, якія ёсьць на мясцох.

У тых выпадках, калі тройка ня можа быць забясьпечана прадстаўніком партыйнай або камсамольскай ячэйкі, раён вылучае ў тройку свайго ўпаўнаважанага.

Тройкі ў сваёй практычнай рабоце абавязаны ўлягваць лепшых актывістаў-ударнікаў сяўбы, калгаснікаў, рабочых саўгасаў і лепшых аднаасобнікаў беднякоў.

5. Праверачныя тройкі ўлічваюць фактычна засеянную плошчу і паяўнасьць годных пад пасеў плошчаў.

6. Праверачныя тройкі павінны ўстанавіць і асабліва ўважліва ўлічыць выкананьне заданьняў на сяўбе кулацка-заможнымі гаспадаркамі, перадаючы даныя на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія ня выконваюць заданьняў сельсавету і РВК для прыняцьця належных мер.

7. Для кіраўніцтва работай праверачных троек у кожным раёне ствараецца раённая праверачная пяцёрка ў складзе: старшыні РВК—ён-жа старшыня раённай праверачнай пяцёркі, сакратара райкому, загадчыка райземаддзелу, старшыні райкалгассаюзу і старшыні РКК. Раённая праверачная пяцёрка арганізуе праверачныя тройкі на мясцох, кіруе іх работай і падсумоўвае даныя праверачных троек.

8. У мэтах мабілізацыі шырокай грамадзкасьці калгасаў, рабочых саўгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вакол праверкі фактычна засеяных плошчаў і выяўленьня дадатковых магчымасьцяй да засеву, на скарачэньні трохдзеньніка ўвечары 11 чэрвеня ўсюды праводзяцца агульныя сходы калгаснікаў, рабочых саўгасаў і сходы беднякоў і сераднякоў кожнай вёскі, на якіх заслухоўваюцца даклады праверачных троек аб выніках праверкі і судаклады старшынь і брыгадзіраў калгасаў (па калгасах), дырэктароў, загадчыкаў вытворчымі вучасткамі і брыгадзіраў саўгасаў (па саўгасах) і прадстаўнікоў сельсаветаў (па вёсках).

9. Даклады праверачных троек павінны быць шырока абгавораны на агульных сходах і на аснове сапраўднага разгортваньня шырокай пралетарскай крытыкі павінны быць выяўлены прычыны адставаньня ў сяўбе пасобных калгасаў, саўгасаў і аднаасобных гаспадарак і дадатковыя магчымасьці да засеву ўнутры кожнага калгасу, саўгасу, вёскі з высоўваньнем сустрэчных пляноў па засеву.

10. На сходах павінны быць шырока распрацаваны практычныя мерапрыемствы па забясьпячэньні своячасовага засеву як плянавых плошчаў, так і выяўленых у парадку праверкі дадатковых плошчаў (насеньне, цягавая рабочая сіла і г. д.).

11. Упаўнаважаныя ЦК і раёнаў абавязаны арганізаваць шырокую ўзаемадапамогу калгасаў і саўгасаў, а таксама дапамогу аднаасобнікаў бедняком і серадняком і калгасам і калгасаў аднаасобнікам—бедняком і серадняком (насеньнем, цягавай рабочай сілай), забясьпечваючы засеў ня толькі плянавых, але і дадаткова выяўленых плошчаў. Улічэце вопыт Ветрынскай МТС аб узаемадапамозе калгасаў пад абавязацельствы МТС.

12. Павінна быць забясьпечана арганізацыя грамадзкага буксіру раёнаў, калгасаў і саўгасаў, якія ідуць наперадзе сяўбы, адстаючым раёнам, калгасам і саўгасам.

13. Старшыні праверачных троек пасьля абгаварэньня іх дакладаў на агульных сходах неадкладна паведамляюць аб выніках праверкі раённым праверачным пяцёркам, а апошнія, пад адказнасьць старшыні, зводныя даныя зараз-жа тэлеграфна паведамляюць Наркамзему.

14. Даныя аб праверцы пад асабістую адказнасьць упаўнаважаных ЦК, сакратароў РК павінны быць паведамлены НКЗему не пазьней 13 чэрвеня.

15. Тав. Рачыцкаму, пад яго асабістую адказнасьць, прапанавана арганізаваць распрацоўку праверачных матар'ялаў у НКЗеме з такім разьлікам, каб вынікі праверкі былі НКЗемам прадстаўлены ў ЦК не пазьней 15 чэрвеня г. г.

16. Даныя праверкі павінны выходзіць з неабходнасьці правядзеньня шырокай жорсткай барацьбы з усякімі апартуністычнымі кулацкімі настроямі, накіраванымі да зрыву сяўбы і невыкананьня плянавых заданьняў па сяўбе. Ніякіх дэмабілізацыйных настроеў да поўнага сканчэньня сяўбы не павінна быць.

Атрыманьне гэтай радыёграмы маніруйце.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Тав. ГІКАЛО Ў КОЙДАНАЎШЧЫНЕ

КОЙДАДНАВА, 6-VI

5-га чэрвеня Койданаўскі раён наведаў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

Тав. Гікало меў гутарку з кіруючымі работнікамі раёну па пытаньнях ходу веснавой сяўбы і шляхох ліквідацыі прарываў у гэтай справе.

Тав. Гікало наведаў калгасы Путчынскага і Нарэйкаўскага сельсаветаў і Путчынскую МТС, дзе гутарыў з калгаснікамі і рабочымі МТС аб ходзе сяўбы.

Тав. Гікало даў рад канкрэтных указаньняў у справе ліквідацыі прарываў у веснавой с.-г. кампаніі.

ГРОМАЎ.

Тав. Шаранговіч на Магілеўшчыне

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу). Сакратар ЦК КП(б)Б т. Шаранговіч наведаў Глінскі і інш. сельсаветы, Чэрыкаўскага раёну. У Глінскім сельсавеце выяўлены праўленьні грубага адміністраваньня, няправільнага выключэньня з калгасаў, дачы цьвёрдых заданьняў серадняком. Зараз прыняты меры да выпраўленьня перагібаў і фарсаваньня тэмпаў сяўбы.

31 мая т. Шаранговіч у Клімавіцкім раёне наведаў калгасы Радзянскага, Лазовіцкага, Забкінскага сельсаветаў. Трактарны парк МТС выконвае толькі 60 проц. вытворчага заданьня. Асноўная прычына невыкананьня — часты паўторны рамонт трактараў. У адказ на пастановы ЦК і прыезд тав. Шаранговіча, раён абавязуецца ў бліжэйшыя дні скончыць сяўбу.

У Касьцюковіцкім раёне, Беладубраўскім і Самацэвіцкім сельсаветах выяўлена асабліва напружанае становішча з выкананьнем пляну сяўбы ў саўгасах. Калгасы і аднаасобнікі, скончыўшыя сяўбу, пераключаюцца на дапамогу адстаючым саўгасам.

У Кармянскім раёне т. Шаранговіч наведаў саўгас імя Войкава і рад сельсаветаў. У саўгасе наглядаюцца праўленьні безгаспадарчасьці, якая мяжуецца з простым злачынствам.

Ва ўсіх пералічаных раёнах тэмпы сяўбы непастарчальныя, за што гэтыя раёны занесены на чорную дошку. Зараз яны рашуча змагаюцца за тое, каб у самы кароткі тэрмін вынесці свае імя з чорнай дошкі.

Лабадаеў.

А ШЫРОКІ АБМЕН ВОПЫТАМ РАБОТЫ ОРГАНАУ КК-РСІ І ЯГО АКТЫВУ

сім удзельнікам сэкцый РСІ саветаў, руп садзейнасьці РСІ, шэфскіх брыгад, дэпутацкіх груп

Ліст тав. Ем. Яраслаўскага

лізарныя задачы стаяць перад КК- і перад усім актывам — удзельні- масавых арганізацый РСІ ў чацвер- заключным годзе пяцігодкі.

умовах разгорнутага сацыялі- ага будаўніцтва, усё большага і ага ўдзелу мас у рабоце сэкцый прафсаюзаў, важнейшае значэньне абыцае асьвятленьне ў друку та- к ажыцьцяўляецца гэта работа. зьяўляецца важнейшай умовай ыховай работы масавай часопісі УсеКП(б)—ЦК-РСІ СССР «За тем качество, проверку». Бяз нашага у ў рабоце часопісі рэдакцыя ня е ажыцьцяпіць у поўнай меры ўленых перад ёю задач.

нэце нам аб тым, як вы право- праверку выкананьня пастаноў лі і ўраду, як змагаецеся вы за ваньне народна-гаспадарчага пля- к выкараненьне бюракратызм і цы- у, яшчэ нежыгты ў нашым са- м апараце, як вучацца справе кі- ньня дзяржавай і прымаюць ак- ы ўдзел у кіраўніцтве масы на вучастках сацыялістычнага бу- тва. Паведамляйце нам аб тым, К РСІ прыцягваюць масы да сва- боты, якія ёсьць недахопы ў гэ- справе, а побач з гэтым пішэце ашых дасягненьнях і перадавым е і праяўленай ініцыятыве з каб другія маглі скарыстаць ва- асягненьні ў сваёй рабоце.

акцыя надае вялікае значэньне пацэнцыям, якія паказваюць, як СІ і яе актыў сваячасова выпраў- ь і папярэджваюць тыя ці іншыя ены, як яны пад кіраўніцтвам рганізацый вядуць барацьбу са ньнымі лініі партыі. Пры гэтым пісаць на толькі аб тым, што зна вамі, якія вынікі атрыманы, якімі сродкамі і шляхамі гэта чута, як праведзена работа, ні- аб людзях, што паказалі сваёй ай бальшавіцкія адносіны да спра б ударніках сацыялістычнага бу- тва.

сьць умоў тав. Сталіна зьяў- да ключом перамогі ў выканань- еравыкананьні народна-гаспадар- ляну заключнага году пяцігодкі. сыстэматычна паказваць у ка- цэнцыях, як КК-РСІ пры ўдзе- сьледвацельскіх брыгад правярае праве ажыцьцяўленьне 6 умоў ьніка па прадпрыемствах, у саў- і калгасах. Асабліву ўвагу трэ- вярнуць на тое, ці своячасова а сыгналізацыя органам КК- б непаладках і скрыўленьнях і одзяць самі КК-РСІ да канца па- справы, як вы вядзеце барацьбу хутчэйшую рэалізацыю ўказань- прапаноў і выпаходжаньняў ра- , калгасьнікаў, за выкананьне ньняў друку, дапамагаючы раз- ньню творчай ініцыятывы мас. лізуйце аб малейшым аслабленьні тым ці іншым вучастку барацьбы партызанізмам на два фронты, ба- ы з прыміренцтвам і гнілым лі- мам.

ны з актывістаў РСІ, кожны к рабкор павінен стаць актыў- ареспандэнтам кіруючай часопісі УсеКП(б)—ЦК-РСІ СССР «За , качество, проверку». Калектыў арэспандэнцый ўдзельнікаў рэй- абсьледваньняў павінны слу- укараненьню і распаўсюджань- ледавога і ўзорнага вопыту са- тычнага будаўніцтва. Карэспан- будуць тым больш кашчым больш яны будуць ца на шырокі вопыт мас, на матар'ял непасрэдна вывучаны актывістамі КК-РСІ, а ня ўзяты з канцылярый установаў ці прадпрыемстваў. Разгортвайце самакрытыку, арганізуйце праверку выкананьня, паказваючы ўзорнае выкананьне і якасьць перш за ўсё ў сваёй рабоце. Пастаянна правярайце і самаправярайце, як выконваюцца дырэктывы чацвертага пленуму ЦККК, які даў разгорнутую праграму баявых задач КК-РСІ у справе выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

Рознастайная практыка работы актыву КК-РСІ і ўдарнікаў друку дае магчымасьць вялізарны вопыт абсьледваньняў і праверкі выкананьня шырока асьвятляць на старонках часопісі. Пры нашым актыўным удзеле неабходна часопісь ЦКК-РСІ пранізаць апэрацыйнасьцю, праз яе сыгналізаваць аб непаладках, аб зрыве на тым ці іншым вучастку работы. Апэрацыйнасьці і дзейснасьці часопісь дасягне тады, калі вы будзеце яя толькі ўдзельнікамі паказу вашага непасрэднага вопыту. Бы павінны асьвятляць у часопісі перадавы вопыт другіх КК-РСІ, масавых арганізацый, скарыстоўваць яго ў сваёй рабоце і ўзяць на сябе абавязак прасоўваньня гэтага вопыту. Паведамленьню аб гэтай ня менш важнай рабоце, аб «напружанай і неаслабнай вайне за панаваньне сфэры застасаваньня добрага ўзору» (Ленін) часопісь надае вялікае значэньне ў сэнсе перабудовы нашай работы на рэйкі апэрацыйнасьці.

У асабліва важных пунктах нашага будаўніцтва рэдакцыя будзе арганізоўваць свае пасты рабкораў і арганізатараў-карэспандэнтаў.

Рэдакцыя чакае ад вас дапамогі і садзейнасьці ў разьвіцьці масавай работы і па стварэньні шырокага масавага актыву вакол часопісі ЦКК УсеКП(б) — ЦК-РСІ СССР.

Для таго, каб сувязь з рэдакцыяй не насіла выпадковага характару, просьба вылучыць спэцыяльнага арганізатара-карэспандэнта і паведаміць яго прозьвішча і адрас, а для маскоўскіх арганізатараў абавязкова і тэлефон.

Рэдакцыя просіць з дапы лістом шырока азнаёміць актыў і апублікаваць яго ў мясцовых насьценных і друкаваных газэтах.

Па даручэньні рэдакцыі
ЕМ. ЯРАСЛАЎСКІ.

Рэдакцыям гарадзкіх і раённых газэт БССР

(Ліст культпропу ЦК КП(б)Б ад 3 чэрвеня 1932 г.)

Тэмпы разгортваньня сяўбы, як адзначана ў пастанове ЦК КП(б)Б, па значнай частцы раёнаў БССР яўна незадавальняючыя. «Асабліва адстаюць калгасы, якія абслугоўваюцца МТС; саўгасы Сьвінаводтрэсту, Садгародтрэсту, ваапэрацыйныя гаспадаркі і сыстэмы Белкаапсаюзу і па ўсіх раёнах аднаасобны сэктар. Пры зусім незадавальняючым агульным ходзе сяўбы ЦК указвае на недапушчальна павольныя тэмпы сяўбы тэхнічных культур і бульбы» (з пастановы ЦК КП(б)Б). У значнай ступені віна за такое становішча на фронце сяўбы кладзецца і на друк. Раённыя газэты за некаторым выключэньнем (Глуск, Чырвоная Слабада, Слуцак, Лёзна) са значным спазьненьнем арганізавалі зьмяшчэньне на сваіх старонках разгорнутых матар'ялаў аб ходзе сяўбы.

Так, газэта «Прамень камунізму»—газэта таго раёну, які занесен на чорную дошку (Шклоў) з аднаго боку зьмяшчае матар'ялы, як яшчэ праходзіць падрыхтоўка да сяўбы, а з другога боку друкуюцца паведамленьні асобных калгасаў аб тым, што яны ўжо скончылі сяўбу. Такім чынам на старонках Шклоўскай газэты ёсьць матар'ялы аб падрыхтоўцы да сяўбы і аб скончаньні асобнымі калгасамі сяўбы, але няма паказу ў газэце работы па непасрэдным выкананьні пасеўных плянаў, адсутнічае паказ і арганізацыя апэрацыйнага кіраўніцтва ўсёй штодзённай, непасрэднай работы па сяўбе.

Шклоўская раённая газэта топчыцца на ўжо пройдзеным падрыхтоўчым пэрыядзе і поўнасьцю абмінае на сваіх старонках галоўны рашаючы этап—этап разгару непасрэднай работы па сяўбе.

Матар'ялы, якія зьмяшчаюцца ў поўнай частцы раённых газэт аб разгортваньні работы па сяўбе, маюць той істотны недахоп, што ў іх усё яшчэ адсутнічае асноўны ўпор на брыгаду, як на рашаючае зьвяно ў арганізацыі працы ў калгасе.

Частка раённых газэт 1 дагэтуль яшчэ не разгарнула адпаведнай арганізацыйна-масавай работы вакол апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжазагатоўках, калгасным гандлі, аб разьвіцьці і захаваньні конскага пагалоўя і новым законе аб сельгаспадатку.

Значны недахоп часткі раённых газэт і ў тым, што яны не паказваюць, як на справе выконваецца пастанова ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка «аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы», як па справе выпраўляюцца ў раёнах «левыя» перагібы, якая канкрэтная дапамога аказваецца калгасьнікам у справе разьвіцьця індывідуальнай жывёлагадоўлі.

Газэты, прапагандуючы апошнія пастановы партыі і ўраду, разам з тым надзвычай слаба растлумачваюць іх канкрэтнае значэньне ва ўмовах данага раёну, данага сельсавету, калгасу і саўгасу.

Клімавіцкая раённая газэта стала на недапушчальны шлях фактычнага ігнараваньня пастаноў партыі. Пастанову аб збожжазагатоўках газэта зьмясьціла ў скарочаным выглядзе, а пастанова ЦК і СНК аб мясазагатоўках і да апошніх дзён яшчэ ня зьмешчана, чым газэта «Камуна» дапусьціла грубейшую палітычную памылку.

Істотным недахопам пэўнай часткі газэт зьяўляецца тое, што ў справе барацьбы за сяўбу эканамічны напрамак спэцыялізаванай гаспадаркі раёну знаходзіць надзвычай слабы адбітак у зьмесьце адпаведных газэт.

У газэтах пытаньні агратэхнікі, барацьбы за самы высокі ўраджай не занялі свайго адказьнейшага месца. У агратэхнічных старонках, якія зьмяшчаюцца, няма паказу прыстасаваньня на практыцы тых аграпрыёмаў, якія друкуюцца ў газэтах.

Культпроп ЦК КП(б)Б абавязвае рэдакцыі раённых газэт выправіць паказаныя недахопы і ў яшчэ большай меры мабілізаваць, пад кіраўніцтвам раённых камітэтаў партыі, усе сілы рэдакцыйнага апарату, рабселькораў, калгаснага актыву і бедняцкоў, серадняцкоў—аднаасобнікаў па поўнае і высокаякаснае выкананьне пляну сяўбы ва ўстаноўленыя тэрміны з тым, каб у бліжэйшыя-ж дні скончыць сяўбу яравых культур і прыступіць да поліва і падрыхтоўкі да ўборкі.

Асабліва зварачаем увагу рэдакцый газэт наступных раёнаў: Ветка, Вушачы, Чырвонапольле, Бягомль, Гомель, Віцебск, Гэчыца, Чачэрск, Уваравічы, Талачыно, Касьцюковічы і Прапойск—як раёнаў, якія занесены за ганебнае адставаньне ў сяўбе цэнтральным органам ЦК КП(б)Б газэтай «Зьвязда», на чорную дошку, на неабходнасьць скансэнтраваць усе свае сілы і энэргію на дапамогу партыйнай арганізацыі ў зьняцьці раёну з чорнай дошкі шляхам поўнага выкананьня і перавыкананьня пасеўных плянаў.

Газэты ўсім сваім зьместам павінны быць яркім прыкладам разуменьня вялізарнай палітычнай важнасьці апошніх пастаноў партыі і ўраду, якія «...ідуць па лініі ажыцьцяўленьня па станоў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, служаць магутным вагаром паскарэньня тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, узмацненьня тавараабароту і савецкага гандлю. Усе яны непарыўна зьвязаны з задачамі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у іх сучаснай арцельнай стадыі, далейшага разгортваньня вялізарных унутраных магчымасьцяй калгаснай гаспадаркі, разьвіцьця калгаснага гандлю хлебам, жывёлай і мясной прадукцыяй, далейшага паляпшэньня работы забесьпячэньня» («Правда»).

Неабходна з бліжэйшых-жа шумароў пачаць зьмяшчэньне разгорнутага паказу работы брыгад, трэба папулярызаваць у друку, як брыгада расставіла свае сілы на полі, як арганізавала 100 проц. выхад у поле, як брыгада дабілася высокіх норм выпрацоўкі. Вазьмеце пад свой непасрэдны нагляд 1-2 брыгады і, паказваючы ім непасрэдную дапамогу, перанясеце іх вопыт на старонкі газэт, паказвайце тых для каго праца стала «справай гонару, справай славы, справай адвагі і геройства».

Сыстэматычна зьмяшчайце апэрацыйныя зводкі аб ходзе сяўбы як па сельсаветах, так і абавязкова па асобных калгасах і брыгадах, а таксама адпаведны прапагандысцкі матар'ял. Асобна трэба зьмяшчаць пастаянныя лічбовыя зводкі і адпаведны артыкульны матар'ял аб выкананьні пляну па сяўбе ільну, канапель і грэчкі.

Практыкуйце па прыкладу газэты «Зьвязда» зьмяшчэньне на чырвонай дошцы—перадавых, на чорнай—адсталых, стварыўшы вакол гэтых дошак такую грамадзкую думку, каб для кожнай калгаснай брыгады і для паасобных калгасьнікаў было сапраўды справай гонару занясеньне на чырвоную дошку, каб сапраўды справай гонару зьяўлялася барацьба за зьняцьце з чорнай дошкі і за заваяваньне месца на чырвонай.

На старонках газэт разгорнута паказвайце вядучую ролю партыйных арганізацый у барацьбе за пасьпяховае правядзеньне сяўбы, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за сацыялістычнае перавыхаваньне ўчарайшага аднаасобніка—сёньняшняга калгасьніка, за выкананьне апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і мясазагатоўках, калгасным гандлі і новым законе аб с.-г. падатку, за выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) аб расстаноўцы партыйна-камсамольскіх сіл у калгасе, аб рабоце з калгасным актывам.

З усёй бязьлітасьцю і рашучасьцю ўскрывайце праваапартуністычную практыку, выяўляйце канкрэтных посьбітаў апартуністычнай стаўкі па самацёк, выяўляйце, рашуча змагайцеся са спробамі затрымаць тэмпы разгортваньня сяўбы, са спробамі замены пасеву ільну, канапель, бульбы іншымі культурамі, з нежаданьнем сеяць грэчку ў раньнія тэрміны, з фактамі слабага напору на кулацка-заможныя гаспадаркі па выкананьні імі цьвёрдых заданьняў па сяўбе, з праяўленьнямі «левых» загібаў, голага адміністраваньня, з «лявацкай» недаацэнкай аднаасобнага сэктару, з недаацэнкай справы разьвіцьця і захаваньня конскага пагалоўя і г. д.

Абавязваем забясьпечыць самую ваострую ўвагу друку пытаньням барацьбы МТС за высокія тэмпы і якасьць сяўбы.

Павядзеце апэрацыйна-масавую работу па мабілізацыі рабочых і спэцыялістаў МТС на хутчэйшае і высокаякаснае выкананьне плянаў сяўбы, перавод трактарных калён і агрэгатаў па гаспадарчы разрахунак, разгарнеце барацьбу нізавога друку за эканомнае выдаткаваньне кожнага кілё гаручага і змазачнага матар'ялу, за рашучую барацьбу з прастоямі і халастымі прабегамі трактараў, за іх самую поўную нагрузку, за безадкладнае ўзьняцьце ролі МТС у барацьбе за хутчэйшае і поўнае выкананьне плянаў сяўбы.

Канцэнтруючы ўсе сілы на пасьпяховым правядзеньні пасеўнай кампаніі, трэба ўжо зараз пачаць рыхтавацца да прапалочнай і ўборачнай кампаніі.

Па выніках пасеўнай кампаніі культпроп ЦК будзе расцэньваць здольнасьць кіраўніцтва гарадзкіх і раённых газэт змагацца за канкрэтныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, за тэнэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў, за па будову ў другой пяцігодцы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Нам, загадчыка культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

Заг. сэктарам друку культпропу ЦК КП(б)Б КУРЦІК.

З 10 чэрвеня—месячнік штурму бездарожжа

Падрыхтоўку да месячніка—на поўны ход!

Фізкультурнікі, у наступ на бездарожжа!

Прэзыдыум Вышэйшага Савету Фізкультуры прыняў пастанову аб удзеле фізкультурнай арганізацыі на ўсебеларускім месячніку дарожнага будаўніцтва.

Прэзыдыум ВСФК пастаніў перад арганізацыяй задачу — даць дарожнаму будаўніцтву ня менш 50.000 працадзён. Гэта значыць, што кожны фізкультурнік абавязан адпрацаваць ня менш 1 дня на дарожным будаўніцтве. На месцы разасланы адказныя таварышы для дапамогі ў разгортваньні кампаніі.

Саветам фізкультуры дана дырэктыва праводзіць масавую работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў вакол задач месячніка, папулярызаваць новы закон аб працоўным удзеле насельніцтва і г. д. Уся работа будзе праходзіць на основе сацыялістычнага спаборніцтва паміж калектывамі, паасобнымі фізкультурнікамі, інструктарамі і раёнамі. З 20 чэрвеня па 5 ліпеня арганізуецца ўсебеларуская эстафэта па пад'агульваньні вынікаў месячніка.

ВСФКБ папярэдзіў саветы фізкультуры, што работа па дарожным будаўніцтве будзе ўлічвацца пры ацэнцы вынікаў удзелу ў 2-гім усесаюзным конкурсе на лепшы калектыў фізкультуры і дакладе прапаганды ідэй сусьветнай спартыяды.

Пры Галоўдартрансе арганізаваны апэрацыйны штаб

У сувязі з абвешчаным месячнікам дарожнага будаўніцтва пры Галоўдартрансе арганізаваны апэрацыйны штаб пад кіраўніцтвам начальніка Галоўдартрансу тав. Фружіна. З 1 чэрвеня ўстаноўлены круглясутачны дзяжурствы штабу.

Канторы мэханізацыі даручана да 5 чэрвеня закончыць рамонт каткоў і ўстаноўку камендрабілак. Для кантролю пастаноўкі сьвабкаэньня рабочых і ліквідацыі перабояў у гэтай справе асобнікуйпаўнаважанаму па снабжэньні даручана камандыраваць у раёны трох работнікаў. Начальнікам дарожна-будаўнічых вучасткаў прапанавана ў пяцідзённы тэрмін забясьпечыць поўнае ўкамплектаваньне ліній аптэчкамі, кіяцільнікамі, прывесьці ў парадак усе інтэрнаты, забясьпечыўшы іх патрэбным абсталяваньнем і г. д. На месцы работ павінен быць арганізаваны сваячасовы і выразны ўлік з такім разьлікам, каб не дапусьціць ні адной хвіліны прастою. Выплата зарплаты будзе праводзіцца кожную дэкаду. Да 10 чэрвеня будзе ліквідавана ўся запазычанасьць па зарплаце за май.

Галоўдартрансам камандыраваны на месцы рад адказных работнікаў для дапамогі ў падрыхтоўцы і правядзеньні месячніка.

Грамадзкае харчаваньне не наладжана

ПАРЫЧЫ, 7. З прычыны адсутнасьці ўвагі з боку раённых арганізацый да справы дарожнага будаўніцтва, мост, які павінен злучыць Зарэчынскі раён са станцыяй Чырвоны-Бераг, будуецца надзвычай марудныміі тэмпамі. Дрэнна наладжана грамадзкае харчаваньне на будаўніцтве. Калі да старшыні РВК тав. Дашко зьвярнуліся па пытаньні наладжаньня харчаваньня, ён адказаў: «дараздзел не сабез і ня можа займацца гэтым пытаньнем». Райпрафсавет ніякай увагі не аддае дарожнаму будаўніцтву і ў прыватнасьці наладжаньню грамадзкага харчаваньня на будаўніцтве. Ён абмежаваўся тым, што прыняў красамоўную рэзалюцыю па дакладу райдарінспэктара. РК КП(б)Б, ЛКСМБ і ячэйкі Аўтадору таксама стаяць у баку дарожнага будаўніцтва.

Тэхнічная нарада, якая адбылася 15 мая пры райпараддзеле, абвясьціла двухмесячнік штурму. Аднак партыйная і прафсаюзная арганізацыі не ўзначалілі гэтай ініцыятывы і месячнік фактычна сарваны. Задача зараз заключаецца ў тым, каб па-бальшавіцку ўключыцца ў абвешчаны 2-гі ўсебеларускі месячнік штурму бездарожжа і своячасова закончыць пабудову маста.

Шчарбакоў.

За лепшы ўдзел у дарбудаўніцтве—прэміі

Цэнтральны штаб дарожнага будаўніцтва вынес пастанову аб прэміраваньні раду калгасаў і асобных работнікаў за ўзорную работу ў часе першага месячніка дарожнага будаўніцтва, які праводзіўся з 15 лютага па 15 сакавіка.

Калгасы імя Сьценькі Разіна, Жаберыцкага сельсавету, і «Новы мір», Пэйскага сельсавету, Крупскага раёну, якія выканалі плян вывазкі будматар'ялаў на 100 проц. прэміраваны па 500 руб. на ўтрыманьне ясьляй. Калгасы «Расьсьвет», Круцкаўскага сельсавету, і «Беларускі батрак», Сакалішчанскага сельсавету, Расонскага раёну, калгас «Акцябр», Полацкага раёну, якія перавыканалі плян вывазкі, першы—на 130 проц., другі—на 120 проц., трэці—на 135 проц. прэміраваны таксама па 500 руб. на ўтрыманьне ясьляй.

Прэміраваны чаравікамі аднаасобнікі Расонскага раёну **Наўраў Я.** (в. Куры, Клясьніцкага сельсавету), які выканаў плян вывазкі на 113 проц., **Літвінаў Я.** (в. Ражнова, Селяшчынскага сельсавету), **Літвінаў Я. і Кубачоў Д.**, якія выканалі плян вывазкі па 140 проц. Ботамі прэміраваны наступныя аднаасобнікі: **Белаеў П.**, які выканаў плян на 175 проц., **Кухаронка В.**, які выканаў плян на 200 проц. і **Белаеў Я.**

За ўмелую арганізацыю работы, у выніку чаго гадавы плян лесаматар'ялаў для дарбудаўніцтва выканан па 101 проц., каменьня звыш пляну вывезена 160 кубамэтраў, прэміраваны дарінспэктар Крупскага раёну **Ізьмір** пасылкай у дом адпачынку на 1 месяц.

Апрача таго, штаб прэміраваў лёгкавым аўтамабілем «Форд» газэту «Калгасьнік Беларусі», за сыстэматычнае асьвятленьне і мабілізацыю грамадзкасьці на правядзеньне месячніка на старонках газэты і шляхам пасылкі брыгад у раёны для арганізацыі спаборніцтва паміж раёнамі, калгасамі і аднаасобнікамі, у выніку чаго ў радзе месц перавыкананы пляны вывазкі будматар'ялаў. Рабселькоры газэты «Калгасьнік Беларусі» т. т. **Сьвірко Х., Кслядзоў В. і Шпакоўскі А.** прэміраваны па 100 руб. кожны. Супрацоўнікі-брыгадзіры газэты—**Жук А., Пархімовіч В і Зубровіч** за актыўны ўдзел у правядзеньні месячніка прэміраваны кожны гарнітурам.

Да адказнасьці—за зрыў дарбудаўніцтва

ЗАСЛАЎЕ. (БелТА). Плян пабудовы мастоў на Заслаўскім раёне выканан толькі на 25 проц. Заслаўскі мясцовы савет, ня гледзячы на катэгарычныя прапановы РВК, праяўляе поўную бязьдзейнасьць у вывазцы дарбудматар'ялаў. Пастановай райвыканкому старшыня мясцовага савету **Альшэўскі** за бязьдзейнасьць у справе дарожнага будаўніцтва зьнят з работы.

Пранч

Аб рабоце калгаснай ячэйкі

тыя за апошнія гады дабілася очных посьпехаў у рэканструк- льскай гаспадаркі — сацыялі- я сэктар стаў вядучым. Барацьбы за далейшае разгортваньне істычнай рэканструкцыі сель- гаспадаркі ў 1932 г., за выка- плянавых заданьняў сельскай аркі выцякае з пастаноў XVII ьнай партыйнай канфэрэнцыі і у непасрэднай сувязі з галоў- літычнай задачай другой пяці- канчатковай ліквідацыяй капі- чных элемэнтаў і клясаў пас- ствараньнем сацыялістычнага савага грамадзтва.

уністычная партыя (б-коў) Бе- ў пастановах свайго XIV зьезду чных дырэктывах Цэнтральна- ітэту паставіла перад вялікова ьнай арганізацыяй у цэлым і калгаснай ячэйкай у асабліва- вялізарныя задачы, выразіць ыяўляецца справай гопару кож- йкі і асобнага камуніста. Да- зваць па такія задачы, як па- ньне плошчы пасеву тэхнічных р ільну і канапель з 239 т. га г. да 370 т. га ў 1932 г., як ньне ўраджайнасьці збожжа- тэхнічных культур, павялі- пагалоўя буйной рагатай жы- а 1.960 т. штук, павышэньне ага стада сьвіней за 1932 г. проц. і г. д. Пры гэтым па до- цыялістычнага сэктару прыхо- пераважная рашаючая роля ў выкананьня пастаўленых за- насьць перажытай, вядучай цыялістычнага сэктару ў вы- прадукцыі сельскай гаспа- ў малейшай ступені не павін- ць узагі партарганізацыі па рабоце сярод аднаасобнікаў, іх арганізацыі па выкананьне гаспадарчых задач бягучага году. Аднаасобны сэктар у вытворчасьці прадукцыі яшчэ займае значнае месца, не калектывізаванымі яшчэ застаюцца каля 50 процантаў усіх гаспадарак. Гэтага нельга недаацэньваць. У падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай недаацэнка аднаасобніка была праяўлена разам асобных арганізацый. Апрача гэтага партарганізацыя ні на мінуту не павінна забываць, што сёньняшні аднаасобнік гэта заўтрашні калгасьнік, што работа сярод аднаасобнікаў зьяўляецца сустаўной часткай работы арганізацыі на сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі—яе калектывізацыі. Мы ня ставім сабе мэтай зараз гаварыць аб рабоце вясковай партарганізацыі ў цэлым, а сканцэнтруем увагу на рабоце галоўным чынам калгаснай ячэйкі.

У рабоце сельскай ячэйкі, асабліва калгаснай кіруючым павінна быць тое палажэньне, што «ў другую пяцігодку разьвіцьцё гаспадаркі Беларусі будзе грунтавацца на базе выкарыстаньня рэсурсаў торфу, лесу і інтэнсыўнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Асноўны напрамак сельскай гаспадаркі Беларусі—гэта прадукцыйная жывёлагадоўля, птушніцтва, тэхнічныя культуры, у прыватнасьці, лён і бульба» (з дакладу т. Куйбышава на XVII партканфэрэнцыі). На лініі спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі партыяй уже дасягнуты значныя посьпехі. Аднак, для поўнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы трэба даваць рашучы адпор асобным ячэйкам і раённым арганізацыям, што дапускаюць тэмпы спэцыялізацыі, інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі (Вушацкі, Дрысенскі і інш. раёны скарацілі плошчы пасеваў ільну супроць намечаных плянам). Адной з важнейшых практычных задач ячэйкі зьяўляецца барацьба за спэцыялізацыю гаспадаркі калгасу, барацьба за вядучую культуру ў калгасе—лён, жывёлагадоўлю, збожжавыя культуры, бульбу.

Калгасная вытворчасьць, арганізацыя працы ў калгасе, пастаянная вытворчая брыгада павінны быць пастаўлены ў цэнтры ўвагі работы ячэйкі. Трэба поўнасьцю разгарнуць шырокія магчымасьці ў справе павышэньня прадукцыйных сіл, якія закладзены ў сацыялістычных формах гаспадаркі. Трэба для гэтага стварыць і ўмацаваць у калгасе грамадзкую дысцыпліну працы, перамагчы дробна-буржуазную псыхалёгію і навыкі калгасьніка, памятаючы, што «там (у калгасе) захоўваюцца перажыткі індывідуалістычнай або нават кулацкай псыхалёгіі» (Сталін). Нельга дапусьціць ідэалізацыю калгасьніка, учарайшага аднаасобніка. У калгасе толькі пачынаецца стварэньне новай грамадзкай дысцыпліны і навучаньне сялян сацыялістычнаму будаўніцтву. «Вялікае значэньне калгасаў у тым іменна і заключаецца, што яны прадстаўляюць асноўную базу для прыстасаваньня машын і трактараў у зямляробстве, што яны складаюць асноўную базу для перапрацоўкі селяніна, для перапрацоўкі яго псыхалёгіі ў духу пралетарскага сацыялізму» (Сталін).

Іменна ў сілу гэтага, у сілу невыстарчальнай барацьбы калгасных ячэек з дробна-буржуазнымі тэндэнцыямі ў 1931 г., значная частка калгасаў разьмеркавала ўраджай не па колькасьці і якасьці затрачанай працы, а па едаках. Ячэйка павінны восьці рашучую барацьбу з дробна-буржуазнымі тэндэнцыямі ў калгасах, трэба дабіцца, каб калгасьнік усвоіў, што разьняркоўваецца даходы будуць па колькасьці і якасьці затрачанай працы, што ацэнка працадня залежыць ад рэзультатаў работы. Ячэйка, ажыцьцяўляючы кіраўніцтва калгасам, не падмяняючы работы праўленьня, кіраўнікоў асобных галін гаспадаркі—брыгадзіраў, павінна дабіцца, каб сапраўды быў пастаўлен улік працы брыгады і асобнага калгасьніка. Нажіроўваць творчую ініцыятыву і актыўнасьць калгасных мас на шлях сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Выяўляць дасягненьні лепшых брыгад калгасьнікаў, рабіць іх дасягненьні здабыткам усёй калгаснай масы, пераносячы лепшы вопыт на іншыя брыгады.

Важнейшай задачай перад ячэйкай павінна стаяць барацьба за высокі ўраджай і прадукцыйнасьць фэрм. Гэта задача ў дакладзе тав. Молатава на XVII партканфэрэнцыі пастаўлена, як адна з галоўных у другую пяцігодку. Калі мы маем перакананчыя факты перавагі калгаснай працы перад аднаасобнай у колькасных адносінах, нагрузка на працаздольнага, цягавую сілу і г. д., дык посьпехі якаснага парадку яшчэ невыстарчальны. У гэтым годзе патрэбна па-сапраўднаму разгарнуць барацьбу за якасныя паказьнікі, барацьбу за высокі ўраджай. Барацьба за высокі ўраджай—гэта адно з важнейшых зьвеньняў умацаваньня калгасу. Дасягнуць гэтага можна толькі прыстасаваньнем дасягненьняў агратэхнікі, аўладаць якою павінны калгасьнікі і ў першую чаргу члены партыі. Ячэйка па-бальшавіцку павінна ажыцьцяніць лёзунг тав. Сталіна «аўладаць тэхнікай», памятаючы, што «тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё», што без аўладаньня агратэхнікай немагчыма павышэньне ўраджайнасьці. Мерапрыемствы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—вось баявая задача калгаснай ячэйкі. Бягучы год павінен даць рашаючыя посьпехі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. «Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і сацыялістычнага выхаваньня калгасных мас павінна стаяць у цэнтры ўвагі і ў другую пяцігодку» (з рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі). Гэта агульная палітычная дырэктыва, даная ў пастановах XVII партканфэрэнцыі, канкрэтна праяўлена на ўвесь бліжэйшы пэрыяд у пастанове ЦК УсеКП(б) ад 4-II 32 г. Ад ступені ажыцьцяўленьня гэтай важнейшай пастановы ЦК залежыць і посьпех калгаснай гаспадаркі ў гэтым годзе, хаця трэба адзначыць, што асобныя ячэйкі і раённыя арганізацыі слаба рэалізавалі гэту пастанову да пачатку веснавых палівых работ і сяўбы.

Важнейшая ўмова па кіраўніцтве гаспадарчай дзейнасьцю калгасу—канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва. Гэта ўмова можа быць дасягнута толькі правільнай расстаноўкай партыйных і камсамольскіх сіл па брыгадах і па важнейшых відучых вучастках калгаснай вытворчасьці. Пры расстаноўцы камуністаў па вытворчасьці ячэйка павінна ўлічваць вытворчую кваліфікацыю і палітычную падрыхтаванасьць камуніста. Апрача правільнага і поўнага выкарыстаньня камуністаў на вытворчасьці ў адпаведнасьці з апошнімі пастановай ЦК УсеКП(б) трэба дабіцца, каб камуніст адыгрываў авангардную ролю на вытворчасьці, быў прыкладам для калгасьнікаў, быў застрэльшчыкам і арганізатарам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Стараючы вакол сябе актыў, апраўчыся на гэты актыў, камуніст павінен быць сапраўдным правадніком пастаноў партыі, пастаноў ячэйкі, павінен сыстэматычна весьці палітыка-выхаваўчую работу з калгасьнікамі—чытка газэт, гутаркі і г. д. Не цягнуцца ў хвосьце настрояў адсталых калгасьнікаў, а даваць ім рашучы адпор.

Чарговай важнейшай задачай ячэйкі зьяўляецца па скончаньні сяўбы, улічваючы леташняя недахопы, своячасовая падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі, асабліва ў частцы забесьпячэньня тэрміновай уборкі і лепшага выкарыстаньня трактараў і ўборачных машын. Асабліва патрэбна падкрэсьліць неабходнасьць своячасовай падрыхтоўкі да ўборкі ільну і яго апрацоўкі. Недахопы працэсу вытворчасьці ў мінулым годзе, пачынаючы з сяўбы да здачы прадукцыі дзяржаве і рэзультаты выкананьня пляну загатовак павінны быць улічаны ўсімі партарганізацыямі.

Слабым зьвяном у рабоце калгасных ячэек зьяўляецца партыйная ўнутры-выхаваўчая работа на сходах ячэек, якія вельмі нерэгулярна, слаба падрыхтоўваюцца, на якіх ставяцца пытаньні гаспадарчага парадку, вытворчыя ў агульнай форме. Трэба ўвесьці для ячэйкі пэўны партыйны дзень, рыхтавацца да яго загадзя, паведамляць членам ячэйкі, якое пытаньне будзе стаяць, што трэба чытаць да партыі. Ставіць на толькі вытворчыя, але і партыйна-палітычныя пытаньні, ставіць іх на канкрэтнае выкананьне. Трэба арганізаваць і праводзіць сходы так, каб на іх члены партыі і кандыдаты вучыліся, выхоўваліся, каб ня было тэй казёнщчыны на сходах, якая ёсьць па радзе ячэек.

Пры здавальняючым росьце вясковай партарганізацыі на 27,5 проц. у 1931 г. супроць 24,1 проц. у 1930 г. і агульным росьце ўсёй арганізацыі на 28 проц. трэба адзначыць слабы рост за кошт жанчын—19,9 проц. да ліку прынятых. Праўда, тут патрэбна адзначыць паогул слабы рост за кошт жанчын усёй арганізацыі—13,6 проц. На пытаньні росту як усім арганізацыям раённым, так і калгасным ячэйкам у далейшай рабоце трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Выключнае значэньне для калгасных ячэек мае марксыцка-ленінскае выхаваньне. Калгасныя ячэйкі па сваім складзе маладыя, тады як абстаноўка і задачы ўскладніліся і патрабуюць ад камуніста адказу на рад пытаньняў, якія без неабходнай палітычнай і тэарэтычнай падрыхтоўкі вырашаць нельга, а з пастаноўкай марксыцка-ленінскай вучобы па радзе арганізацый (Дрысенская, Крупская і інш.) вельмі кепска. У гэтых раёнах за зіму не праведзены парады з кіраўнікамі школ, гурткоў, у школах якасьць вучобы нізкая, яўка не перавышае ў сярэднім 50 проц. і г. д. Нездавальняюча пастаўлена вучоба ў радзе арганізацый і з новым папаўненьнем партыі, асабліва калі ўлічыць тую акалічнасьць, што з прынятых у партыю за 1931 г. у сярэднім да прыёму прайшлі школы, гурткі толькі каля 40 проц. Напрыклад, у Гомель

БОЛЬШ МАСАВАЙ, АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ У РАЗГОРТВАНЬНІ КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ

Адпор спэкулянтам-перакупшчыкам, якія прабуюць нажыцца на гандлі с.-г. прадуктамі

Гомельскія арганізацыі марудзяць з разгортваньнем калгаснага гандлю

ГОМЕЛЬ. (Па тэлефону).

Партыйнай арганізацыяй гораду, вясковымі ячэйкамі КП(б)Б і сельскімі саветамі праведзена вялікая работа па растлумачэньні і папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду. Пастановы аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках, с.-г. падатку, калгасным гандлі сустрэчаны ўздымам новай хвалі энтузіязму калгаснікаў і працоўных адзіначобнікаў, павышэньнем вытворчай і палітычнай актыўнасьці кожнага члена с.-г. арцелі.

Рад калгасаў адказаў на пастановы партыі і ўраду ня толькі павышэньнем тэмпаў сяўбы, але засевам культур вышэйшага ліку. Калгасы падшэфныя заводу Сельмаш засеялі 6 га бульбы, падшэфныя дровакалібінату — 2 га бульбы, калгас падшэфны порту — 2 га бульбы, калгас «Барэц» засеў 1 га проса і 1 га ячменю. Уся прадукцыя ад гэтых гэктараў будзе рэалізавана праз калгасны гандаль.

Многія калгасы (праўда, у адзіночку, неарганізавана) вывозяць і прадаюць свае лішкі на рынак. Сярод іх калгас «Чырвоны хлебароб», які за адзін выезд рэалізаваў прадуктаў на суму каля 1.000 руб.

Гомельскія рынкі зараз набылі новы асаблівы выгляд як па сваёй выключнай шматлюднасьці, так і па асартымэнце і колькасьці вывезеных прадуктаў сельска-гаспадарчага вырабу. Рынак напоўнен такімі прадуктамі, як сала, масла, яйкі, мяса (у забітым і жывым выглядзе), гародніна (бульба, цыбуля, рэдзька, морква).

На фоне новага патоку прадуктаў асабліва яркі акрэсьліваюцца задачы гарадзкіх партыйных, калгасных, прафсаюзных, каапэрацыйна-гандлёвых арганізацый і органаў Наркамснабу.

З іх боку патрэбна арганізаваць гэты паток, накіраваць на савецкім шляху, усямерна заахвочваць і пашыраць вываз лішкаў с.-г. прадукцыі на рынак, наладзіць арганізаванае выступленьне калгасаў, зрабіць калгасны гандаль рашаючым фактарам савецкага рынку.

Аднак, гомельскія арганізацыі не зразумелі, што калгасны гандаль трэба арганізаваць і палажыліся цалкам на самацёк. У буйнейшым прамысловым цэнтры няма колькі-небудзь арганізаванага калгаснага гандлю. Ёсьць толькі адна пастанова гаркому КП(б)Б ад 27 красавіка, ёсьць міжведамственныя спрэчкі, каму будаваць ларкі, а нават дзе адводзіць плошчу пад рынак. Ёсьць некалькі нясьмелых спроб адкрыць калгасныя магазыны і ўжо шмат скажэньняў прынцыпаў калгаснага гандлю.

Як арганізуюць калгасны гандаль райкалгассаюз і гарспаб можна меркаваць хаця-б па тым, што пасьля зрыву выезду калгаснікаў 27 красавіка ім ня прынята якіх-бы там ні было крокаў у гэтым напрамку.

Паводле пляну, трэба было пабудаваць на рынку 35 ларкоў для гандлю калгасаў с.-г. прадуктамі і адкрыць пры буйных прадпрыемствах 10 крам. Гэтымі днямі прадстаўніком ЦК КП(б)Б т. Сакалоўскім зроблена праверка, як выконваецца паказаны плян. Вынікі — ларкі не пабудаваны. Старшыня гарсавету т. Браўковіч заяўляе: «грошай няма, будаваць ня будзем». Камгас абмежаваўся тым, што прапанаваў (неведома каму) «адвесьці месца на Конскай плошчы і на Савецкай». Гэтай паперкай справа скончылася, а плошча так і не адведзена.

Каапэрацыйна-гандлёвыя арганізацыі Гомелю, па сутнасьці, стаяць у баку ад разгортваньня калгаснага гандлю. Сваю дзейнасьць на рынку яны зьвялі ў адным выпадку да загатоўчых апэрацый, практыкуючы даволі шырока тавараабмен (асабліва ЗРК «Камінтэрн»), а ў другім — да рэалізацыі прамтавараў (прамкаапэрацыя і інвалідная каапэрацыя) па цане ня нізкай рынкавна-спэкуляцыйнай.

Што агульнага мае, з дазволу кажучы, гэта работа з задачамі каапэрацыі?

Акрытыя з дапамогай ТСТ чыгуначнікаў і ЦРК дзьве калгасныя крамы зьяўляліся ўзорамі неразуменьня гэтымі арганізацыямі сутнасьці калгаснага гандлю. Яны (ТСТ і ЦРК) адвялі ў свае крамы па адной палічцы, на якіх ляжыць і рэалізуецца прадукцыя калгасаў, зданая імі ў лік цэнтралізаванага пляну. У гэтых крамах няма ніводнага кілё прадукцыі — лішкаў.

У заключэньне прывядзем заяву райса т. Кандраценкі: «Нічога ня зроблена, заняты пасеўнай кампаніяй».

Няўменьне спалучыць разгортваньне калгаснага гандлю з іншымі работамі, стаўка на чарговасьць кампаній характэрны для ўсіх, без выключэньня, гомельскіх арганізацый, якім належыць займацца калгасным гандлем.

В. Самуцін, Н. Гафт.

Тысячы вазоў на першым савецкім рынку у Бабруйску

БАБРУЙСК. (Па тэлефону ад наш. спэц. кар).

5-га чэрвеня адбыўся першы савецкі рынак. Раённым камітэтам партыі, райвыканкомам, была праведзена значная арганізацыйна-масавая работа па растлумачэньні апошніх пастаноў ЦК і СНК аб мяса і збожжазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю. Для правядзеньня гэтай работы ў сельсаветы былі накіраваны адказныя работнікі.

На першы рынак выехала арганізавана каля 40 калгасаў—400 фурманак. Усяго-ж у гандлі прымала ўдзел тысячы вазоў калгасаў і калгаснікаў.

Першы масавы выезд калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў на савецкі рынак быў адзначан лятучым мітынгам, на якім выступалі з прамовамі аб значэньні апошніх пастаноў партыі і ўраду старшыня РВК тав. Сьцяпанаў, старшыня райпрафсавету тав. Філіпенка, старшыня райкалгассаюзу тав. Дамко, калгаснікі і г. д.

На савецкім рынку адкрыты чатыры ларкі для калгаснага гандлю. Устаноўлена таксама 5 ваг для дробнага разважваньня. Каапэрацыйнымі арганізацыямі адкрыты 22 ларкі для продажу прамтавараў калгаснікам. У гэты дзень было прадана прамтавараў на 45.000 руб. Прамтавары прадаваліся выключна за грошы.

Цэны на с.-г. прадукты зьнізіліся. Бульба прадавалася па 5 руб. за пуд, замест ранейшых 11 руб., масла раніцою прадавалася па 10 руб., а ўжо у 12 гадз. па 6-7 руб. Цэны на яйкі зьнізіліся з 4 руб. да 2 руб. 50 к. за дзесятак, на сьмятану з 6 да 3 руб. за літар, на куры з 16 да 5-6 руб. за штуку.

На рынак было вывезена шмат гародніны, якая прадавалася па нізкіх цэнах. Калгаснік с.-г. арцелі «Чырвоная Беларусь», садоўнік тав. Самуцін прывёз воз маладых гуркоў і зялёнай цыбулі. Гуркі прадаваліся па 20 кап. за штуку. На рынку было многа мяса, якое прадавалася па 5 руб. кілё, замест ранейшай цаны ў 8 руб.

«Чырвоны Крым» адкрыў чайную. Сампрамсаюз арганізаваў рад дробных майстэрань для рамонту абутку калгаснікаў. Для апошніх адкрыта таксама сталоўка.

Бабруйскія арганізацыі ставяць сваёй мэтай ня спыняцца на дасягнутым, а яшчэ больш разгарнуць калгасны гандаль і ў бліжэйшы час арганізаваць пры кожным прадпрыемстве калгасную краму для продажу калгаснікамі лішкаў сваёй прадукцыі рабочым.

Неабходна толькі, каб была ўзмоцнена барацьба са спэкулянтамі-перакупшчыкамі.

Дашкевіч.

Пакончыць з „лявацкім" адміністраваньнем

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Барысаўскі раён мае некаторы вопыт у арганізацыі масавых выездаў калгасаў, калгаснікаў, аднаасобнікаў на савецкія рынкі. З 27 красавіка па 25 мая адбыліся 4 рынкі. На іх прадана калгасамі і калгаснікамі 3.769 літраў малака, 65 кгр. масла, 50 літраў сьмятаны і рад іншых прадуктаў. У гандлі прынялі ўдзел 124 калгасныя фурманкі, 688 калгаснікаў і 14 аднаасобнікаў.

Вынікі першых рынкаў ушчэнт разьбіваюць апартуністычныя разважаньні некаторых раённых работнікаў аб тым, што калгасам «няма чым гандляваць». На адным толькі рынку 29 мая, у якім прыняло ўдзел каля 100 фурманак калгасаў, прадана 1.500 літраў малака, сьмятаны і рад іншых прадуктаў, што зьбіла спэкуляцыйныя цэны. Цэны на масла зьнізіліся з 25 руб. за кілё да 15-16 руб., на малако —з 1 р. 20 к. літр да 60-80 к. літр. Гэта самае і з іншымі прадуктамі.

Як буйны недахон трэба адзначыць, што на рынках прынялі ўдзел, галоўным чынам, калгасы, якія знаходзяцца блізка ад гораду. Гэта гаворыць аб тым, што партыйныя, калгасныя і прафсаюзныя арганізацыі не правялі арганізацыйна-масавай работы ў калгасах, якія знаходзяцца ў глыбінных пунктах раёну.

Асабліва патрэбна завастрыць увагу на «лявацкіх» нерагібах, якія мелі месца пры арганізацыі першых выездаў. На першым базары было адведзена асобнае месца для калгаснікаў, куды не дазвалялі заязджаць аднаасобнікам, што выклікала недаўменнасьць апошніх. На бачным месцы вывесілі прэйскурант, у якім калгаснікам і калгасам прапанавалася прадаваць свае тавары па вызначаных цэнах.

Гэта «лявацкае» адміністраваньне было дапушчана на другім і трэцім базары. У Н.-Барысаве (29 мая) была склікана нарада ўсіх удзельнікаў рынку, дзе прапанавана прадаваць па цэнах, вызначаных райснабам і райкалгассаюзам.

Спажывецкая каапэрацыя, замест таго, каб арганізаваць сустрэчу прамтаварамі, разгарнуць савецкі гандаль, стала на шлях простага тавараабмену. Калгаснік, прадаўшы свае лішкі, атрымліваў па тры мэтры мануфактуры, або кавалак мыла. За 6 літраў малака адпускалася 3 мэтры мануфактуры, або іншыя прам тавары.

Рынак 5 чэрвеня паказаў неразуменьне да гэтага часу некаторымі барысаўскімі арганізацыямі і работнікамі задач і значэньня разгортваньня калгаснага гандлю. Ня гледзячы на тое, што на складах райпрамсаюзу і «Белгандлю» тавары замарожваюцца, на рынку іх ня было. Райснаб, райкалгассаюз, райпрафсавет не правялі папярэдняй работы.

Барысаўскія раённыя арганізацыі пайшлі безадкладна выправіць дапушчаныя памылкі і ўдарыць па тых, хто «лявацкім» адміністраваньнем імкнецца падрываць калгасны гандаль.

Нэйдлін.



Калгаснікі прывезьлі на рынак малако (Барысаў).

ДОМ УРАДУ Ў КАМЕННАГА МАСТА (МАСКВА).

На менскім рынку 5 чэрвеня

Да 8 гадз. раніцы вялізарны плошча імя Парыскай Камуны ў Менску быў запружан калгаснымі возамі, калгаснікамі, аднаасобнікамі з лішкамі прадукцыі.

З трамваю № 2 бязупынна выходзілі людзі з кошыкамі. Адчувалася, што насельніцтва Менску ведала аб базары, падрыхтавалася да яго. Але ня ўсім падрыхтаваліся да базару мясцовыя арганізацыі.

Вазы станавіліся дзе попала. У рэзультаце пакупцы ня мелі праходу і не маглі прайсьці да вазоў. Гэта штурханіна тлумачыцца тым, што загадзя ня былі адведзены месцы для радоў: гародных, мясных, малочных, мучных вазоў і г. д. Калі-б былі такія рады, на базары быў-бы парадак, пакупнік ня траціў-бы лішняга часу ў пошуках таго ці іншага прадукту. Нічога ня было зроблена для таго, каб абставіць гандаль на базары больш-менш добра: ня было ні латкоў, ні лавак для гародніны і малака, ні вагі. Ля гарадзкой вагі ўвесь час стояла вялізарная чарга прадаўцоў і пакупцоў. Для таго, каб адважыць фунт масла калгаснику і пакупніку прыходзілася стаяць па гадзіне-паўтары ў чарзе ля вагі. А калі ўлічыць, што селяніну прыходзілася па некалькі раз бываць ля гарадзкой вагі, то можна сабе ўявіць, колькі часу патрачана кожным.

Адзначальнай рысай базару 5 чэрвеня зьяўляецца мноства рознастайных прадуктаў харчаваньня. У вялікай колькасьці была раньняя гародніна, масла, яйкі, сьметана, малако. У некалькі меншай колькасьці, але былі і мясныя прадукты: сьвініна, сала, цяляціна, птушка. Прычым усе гэтыя прадукты прадаваліся непасрэдна калгаснікамі і працоўнымі сялянамі.

Цэны на прадукты былі некалькі нізкэй, чым 2-3 тыдні таму назад. Так, фунт масла — 7—7 р. 50 к., сыр — 3—4 руб., пучок радыскі — 40-45 к., цяляціна — 2—2 р. 50 к. фунт, яйкі —3—3 р. 50 к. дзесятак.

Вельмі дрэнна падрыхтавалася каапэрацыя да базару. Было толькі некалькі ларкоў, прычым мала было тавараў шырокага спажываньня.

Калгасны гандаль на менскіх рынках разгортваецца. Але трэба гэтыя рынкі абсталяваць, упарадкаваць і стварыць усе ўмовы, якія-б забясьпечылі культурны савецкі гандаль.

А-м.

МІЛЬЁНАМІ ПАЗЫКІ „4-га ЗАКЛЮЧНАГА"

ЗЯБЯСЬПЕЧЫМ ПАБУДОВУ НОВЫХ ГІГАНТАЎ ІНДУСТРЫІ

Далучаюцца і абавязваюцца

«Магутныя гіганты сацыялістычнай буйоўлі — Сталінградзкі і Харкаўскі трактарныя заводы, Маскоўскі аўтамабільны, Урала-Кузбас, Магнітабуд і Дняпрабуд пабудаваны і будуюцца волей рабочай клясы, пад кіраўніцтвам сталёвай партыі бальшавікоў.

Перад намі ў будучым стаяць яшчэ большыя задачы. У другой пяцігодцы мы павінны пабудаваць бясклясавае грамадзтва, даць краіне яшчэ сотні тысяч трактараў, камбайнаў і аўтамабіляў, патроіць снабжэньне рабочых. Для гэтага патрэбны сродкі. Капіталісты нам іх не даюць. Мы павінны адшукаць іх унутры краіны.

Агульны сход членаў ІТР Беларускай вярэцкай Саюзтранс падтрымлівае ініцыятыву перадавых заводаў аб выпуску новай пазыкі і абавязваецца падпісацца на пазыку ня менш як на месячны аклад пэнсіі» (З рэзалюцыі сходу).

***

«Агульны сход рабочых і адм. тэхн. пэрсаналу калгасу «Ялава», Чавускага раёну, падтрымлівае ініцыятыву рабочых заводу «Бальшавік» і рабочых саўгасу «Івань», Слуцкага раёну, аб выпуску новай пазыкі і абавязваецца ахапіць падпіскай рабочых і служачых саўгасу ня менш 100 проц. заработнай платы». (З рэзалюцыі сходу).

***

«Мы, супрацоўнікі і асьпіранты БАН, цалкам і поўнасьцю далучаемся да просьбаў рабочых перадавых прадпрыемстваў аб выпуску пазыкі 4-га, завяршаючага году пяцігодкі.

З свайго боку бяром на сябе наступныя абавязкі:

1. Разгарнуць папярэднюю падпіску на пазыку сярод супрацоўнікаў і навуковых работнікаў.

2. Ахапіць падпіскай усіх работнікаў БАН ня менш, як на 100 проц. заработнай платы.

Выклікаем на сацспаборніцтва —на лепшае правядзеньне пазыкі інстытут прамысловасьці; БДУ і Камвуз». (З рэзалюцыі агульнага сходу).

***

«Мы работнікі Дзяржпляну, улічваючы вялікарнейшыя задачы, пастаўленыя перад намі, абвяшчаем сябе мабілізаванымі на хутчэйшае складаньне другой пяцігодкі. Мы цалкам падтрымліваем ініцыятыву рабочых буйнейшых заводаў Саюзу і Менску аб выпуску пазыкі 4-га заключнага і бярэм на сябе абавязак ва ўдарным парадку правесьці папярэднюю падпіску, ахапіўшы ўсіх работнікаў ня менш як на месячны аклад зарплаты». (З рэзалюцыі сходу).

***

«Агульны сход рабочых і служачых Старобінскага леспрамгасу падтрымлівае ініцыятыву перадавікоў аб пазыцы рабаванымі ад ураду выпуску новай пазыкі.

Аб фактах невыкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б аб работніках спажыўкаапэрацыі

Пастанова ЦК КП(б)Б

Ня гледзячы на рад дырэктыў па пытаньні кадраў спажывецкай каапэрацыі і апошнюю пастанову ЦК КП(б)Б ад 28-IV-32 г. аб забароне зьнімаць з работы старшынь райспажыўсаюзаў і загадчыкаў райзагаў, забясьпечваючы ўсямернае ўзмацненьне лепшымі работнікамі спажывецкай каапэрацыі, на якую ўскладзена вялізарнейшая адказнасьць у сувязі з тавараазваротам і асабліва ў сувязі з апошнімі пастановамі партыі аб збожжа-мясазагатоўках і гандлі калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, рад РК КП(б)Б (Клімавічы, Жлобін, Веткаўскі) недапушчальна парушаюць гэтыя дырэктывы, што прыводзіць да аслабленьня работы спажыўкаапэрацыі.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Сакратару Клімавіцкага РК—тав. Крыпецу за зьняцьце старшыні райспажыўсаюзу, сакратарам Жлобінскага і Веткаўскага РК КП(б)Б за зьняцьце заграйзагаў — абвясьціць вымову і прапанаваць неадкладна зьвярнуць узятых таварышоў на ранейшую работу.

2. Папярэдзіць усе РК і ГК, што пры паўтарэньні падобнага, зусім нетапучнага ігнараваньня рашэньня ЦК будуць прымацца больш суровыя меры.

3. Абавязаць РК і ГК па прадпяту дзьвёх дзнаў праверыць працаздольнасьць кіруючага складу работнікаў райспажыўсаюзаў, райзагаў і сельпо і прыняць рашучыя меры да яго ўзмацненьня.

4. Даручыць камісіі ў складзе т. т. Рыськіна, Хаскіна і Агранёўскага праверыць выкананьне ўсіх ранейшых дырэктыў аб кадрах спажывецкай каапэрацыі і распрацаваць мерапрыемствы па ўзмацненьні кадрамі спажывецкай каапэрацыі.

5. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

Сакратар ЦК КП(б)Б — ГІКАЛО.

Узор бюракратычных адносін

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону).

4-га чэрвеня паасобныя калгасы і калгаснікі прадавалі лішкі сваёй прадукцыі на рынку ў Маркаўшчыне—буйным пралетарскім раёне. Калгасны гандаль зьбіў спэкуляцыйныя цэны. Да прыезду калгасных фурманак, прыватнік прадаваў малако па 1 р. 20 к. за літар, бульбу—9-10 руб. за пуд., а потым гэтыя цэны былі зьніжаны па малаку—да 60-70 кап. за літар, а бульбы—6 руб. пуд.

Па Віцебскім раёне ёсьць многа калгасаў (імя Чырвонай арміі, „Прагрэс", імя Молатава і інш.), якія маюць магчымасьць у масавым парадку выяжджаць на савецкія рынкі са сваёй прадукцыяй, але яны прадастаўлены самі сабе. Ніякай арганізацыйна-масавай работы сярод калгаснікаў не вядзецца.

Наогул райкалгассаюз недацэньвае свёй ролі ў справе разгортваньня калгаснага гандлю. Райкалгассаюз спадзяецца на самацёчны выезд калгасаў і калгаснікаў на савецкі рынак.

Месца для калгаснага гандлю на рынку ня вызначана. Райкалгассаюз „забыў" аб неабходнасьці выканаць сваю-ж пастанову аб пабудове на рынку 5 крам і 12 ларкоў. Да гэтага часу ў гэтай галіне нічога ня зроблена.

Каапэрацыйныя арганізацыі, многія ЗРК фармальна адносяцца да гэтай важнейшай справы і не садзейнічаюць разгортваньню калгаснага гандлю.

Брайнін.

Н. ЦЯРЭНЦЬЦЕЎ

Урад кампрамісу ў Японіі

Японскі ўрадавы крызіс, які зацягнуўся на многа дзён, вырашыўся назначэньнем надпартыйнага габінэту Саіто. Гэты крызіс быў выклікан, як вядома, забойствам Сэйюкайскага прэм'ера рэакцыйнымі тэрарыстамі. Забойства суправаджалася іншымі тэрарыстычнымі і дывэрсыйнымі актамі, уключаючы спробу пакінуць Токіё без вады і электрычнай энэргіі. Гэтыя падзеі ў сваю чаргу зьявіліся толькі найчоўшым этапам дзейнасьці тайных рэакцыйных арганізацый фашысцкага тыпу, якія некалькі месяцаў таму назад ажыцьцявілі забойства міністра фінансаў папярэдняга габінэту Інуэ і барона Дана — галоўнага кіраўніка буйнейшага японскага капіталістычнага канцэрну Міцуі, і якія рыхтавалі серыю новых тэрарыстычных актаў. Роўным чынам майская спроба фашысцкага перавароту ці правільней дэманстрацыя зьвязаная з гэтай спробай непасрэдна пераклікаецца з вайнай змовай, якая была выкрыта ў лістападзе мінулага году і ставіла сваёй мэтай зьвяржэньне канстытуцыйнага ўраду і аднаўленьне «целаснасьці» імператарскай улады.

Для правільнай ацэнкі гэтых падзей, а таксама і выходу апошняга ўрадавага крызісу трэба мець на ўвазе, што палітычныя забойствы апошніх месяцаў зьяўляюцца ня актамі клясавай помсты, а толькі вылучэньнем абвастрэньня барацьбы ўнутры буржуазна-памешчыцкага блёку, які кіруе Японіяй. Гэты блёк мае, зразумела, сваё фэадальнае, памешчыцкае крыло, цесна зьвязанае з вайсковымі коламі, і сваё капіталістычнае крыло, якое апіраецца на гігантскія манапалістычныя канцэрны, але ў тым і заключаецца асаблівасьць японскага капіталізму, што ён сам з усіх бакоў апляцен густой сеткай дакапіталістычных адносін, і што ў гэтай краіне капіталізм ня толькі блёкаваны з фэадальнымі элемэнтамі, але ў значнай меры амальгамаваны з імі.

Падзеі апошніх месяцаў бязумоўна знамянуюць шпаркае прасоўваньне Японіі па шляху, які вядзе да адкрытай фашысцкай дыктатуры. Мы ўжо ўказвалі, што фашысцкі рух у Японіі разгортваецца адначасова і па лініі тайных таварыстваў, тыпу «лігі кроўнага брацтва», якая якраз і арганізавала тры апошнія забойствы — і па лініі вайсковых арганізацый афіцэраў і запасных, якія высоўваюць сваіх уласных лідэраў і, нарэшце, па лініі існуючых палітычных партый, не выключаючы сацыял-дэмакратычнай і рэфармісцка-цэнтрысцкай, якія вылучылі свае ўласныя адкрыта-фашысцкія групоўкі. Але фашызм Японіі, пры ўсёй яго сваласаблівасьці, мае ў асноўным тую-ж клясавую прыроду, што і фашызм у заходніх капіталістычных краінах. Гэта азначае, што ўзьнікаючы як рух спалоханай крызісам і рэвалюцыйнай пагрозай дробнай буржуазіі, якая блёкуецца з самымі махровымі прадстаўнікамі палуфэадальнай памешчыцкай рэакцыі, — фашызм зараз-жа скарыстоўваецца і ўзначальваецца буйным фінансавым капіталам, дыктатура якога і аказваецца рэальным зьместам фашысцкай дыктатуры.

Так імена стаіць справа і ў Японіі. Фашысцкая дыктатура ня зьменіць клясавай прыроды японскай дзяржавы. Яна будзе азначаць не перамогу фэадальнага крыла, кіруючых у Японіі колаў над іх капіталістычным крылом, а далейшае ўмацаваньне іх змычкі. Тая акалічнасьць, што адзай з першых ахвяр фашыстаў быў кіраўнік буйнейшага канцэрну — не паказальная. У цяжкім змаганьні за выхад з крызісу на шляхох фашысцкай дыктатуры кіруючая кляса часамі гатова ахвяраваць і больш цэннымі для яе рэчамі, чым жыцьцё аднаго з яе прыказчыкаў, хаця бы самых адказных, да ліку якіх бясспрэчна належаў і наёмны кіраўнічы фірмы Міцуі.

Патрабаваньні, што высоўваюцца армейскімі арганізацыямі, каб «Манчжурыя эксплёатавалася «ў інтарэсах усяго народу, а ня кучкі капіталістаў» — маюць ня большае палітычнае значэньне, чым гітлераўскія абвяшчэньні наконт раздрабненьня буйнога капіталу і ператварэньня Германіі ў краіну нічасьлівых дробных уласьнікаў. У гэтым і ў іншым выпадку гэта дэмагогія не выкрывае, а прыкрывае той факт, што фашызм ёсьць рух за дыктатуру буйнага капіталу.

Але калі так, дык барацьба, якая адбываецца ўнутры лягеру кіруючых клясаў Японіі, ёсьць толькі барацьба з-за шляхоў і мэтадаў фашызацыі, або яшчэ больш дакладней — барацьба розных груп за ўзначаленьне гэтай апошняй. Менна гэты сэнс і меў сучасны ўрадавы крызіс у Японіі. Адстаўка параўнальна ўмеркаванага Інуэй прыняла да кіраўніцтва партыяй Сэйюкай яркая рэакцыйную групу, узначаленую былым міністрам унутраных спраў Сузукі, які карыстаўся на працягу многіх год рэпутацыяй галоўнага аднаўца тых самых тайных фашысцкіх арганізацый, да ліку якіх належыць славутая «ліга кроўнага брацтва». Апіраючыся на ўсасільны партыйны апарат, які кантраляваў у даны момант усю адміністрацыю краіны (сэйюкайскі ўрад зараз-жа пасьля прыходу да ўлады ў сьнежні мінулага году пасьпяшаўся, зразумела, зьмяніць губэрнатараў і адказных чыноўнікаў у правінцыі і назначыў сваіх людзей). Сузукі і яго група разьлічвалі ўзначаліць дыктатуру, фашысцкую па сваім зьмесьце, але якая захоўвае выгодны для іх прынцып партыйнага ўраду.

Супроць Сузукі выступіла, аднак, кааліцыя некалькіх сіл. Адкрыта варожая Сузукі сэйюкайская групоўка на чале з былым міністрам чыгунак Токанамі і буйным фінансістам Кухарай таксама схіляецца да фашысцкіх мэтадаў і таксама гатова ажыцьцяўляць фашысцкую праграму, але паколькі партыйны апарат знаходзіцца ў руках Сузукі, гэта група ўжо некалькі месяцаў прапаведуе стварэньне каліцыйнага ўраду. Апошняга дамагаліся таксама колы апазыцыйнай партыі Мінсэйта і, у прыватнасьці, адкрыта фашысцкая група Адацыі, што стварылася ў складзе гэтай партыі. Але рашаючую ролю адыгралі вайсковыя колы. У гэтых колах няма колькі-небудзь прыкмётных праграмных разыходжаньняў з цяперашнімі лідэрамі партыі Сэйюкай. У сваёй прамове, сказанай на сходзе парляманцкай фракцыі, пасьля абраньня яго правадыром партыі, Сузукі сказаў па сутнасьці тое самае, што гаворыць або хочуць сказаць правадыры армейскіх арганізацый. Ён аддаў даніну спэцыфічнай фашысцкай дэмагогіі, падкрэсьліўшы неабходнасьць дастасаваньня тэрміновых мер «да зьяўленьня няўстойлівасьці, якая адчуваецца шырокімі колямі» і, у прыватнасьці, аказаньня дапамогі сельскай гаспадарцы. Ён разам з тым амаль літаральна паўтарыў пікатразовыя запы вайсковых лідэраў адносна неабходнасьці «асьвяжэньня» замежнай палітыкі і, у прыватнасьці, палітыкі ў Манчжурыі. Ён намеціў, такім чынам, выразную праграму рэакцыйнага тэрору ўнутры краіны і ўзмацненьня агрэсыўнасьці звонку. Другой праграмы ў вайсковых арганізацый няма.

Засталіся, аднак, «арганізацыйныя разгалоскі». У японскім армейскім асяродзішчы за апошні час адбываліся цікавыя працэсы. Стары генэралітэт, цесна зьвязаны з існуючымі партыйна-палітычнымі машынамі, і ў прыватнасьці, з партыяй Сэйюкай — адсунуты на другі плян. Афіцэрскае асяродзішча і афіцэрскія арганізацыі ўзначалены групай «маладых» пакшталт вядомай «палкоўніцкай групы», на чале якой стаіць польскі фашыст. Гэта група, адным з выдатнейшых кіраўнікоў якіх зьяўляецца цяперашні і былы вайсковы міністар Аракі апіраецца на масавыя вайсковыя арганізацыі. Яна пэрсаніфікуе, калі так можна сказаць, надзвычайны характар крызісу, які перажываецца японскім капіталізмам і поўнае адступленьне ад ардынарных традыцыйных мэтадаў барацьбы за выхад з гэтага крызісу.

Гэта японская «палкоўніцкая група» не задавальняецца кантролем над арміяй; яна імкнецца кантраляваць усю краіну і вырашаць японскі капіталізм па-свойму. Цесна зьвязаная ў нядаўнім мінулым з тым-жа Сузукі і з іншымі фашысцкімі плынямі палітычнага жыцьця Японіі, яна зараз, калі справа падыходзіць да рэальнага ажыцьцяўленьня фашысцкай дыктатуры, рашуча патрабавала надпартыйнага ўраду. Яна хоча адхіліць ад улады сэйюкайскі партыйны апарат і паставіць на яго месца свой уласны, які забясьпечыць ёй вярхоўны кантроль.

Заняжны характар японскага ўрадавага крызісу тлумачыцца іменна гэтай закуліснай барацьбой. Кандыдатуры Сузукі вайсковыя колы процідаставілі кандыдатуру Хіранумы — віцэ-старшыні тайнай рады, які зьяўляецца адным з буйнейшых правадыроў японскага фашызму. Сілы, аднак, уроўнаважыліся і рэзультатам зьявілася зьяўленьне каліцыйнага габінэту Саіто. Саіто, які два разы быў генэрал-губернатарам Карэі і зьвязаны больш з Мінсэйта, чым з Сэйюкай зьяўляецца сапраўды нэйтральнай фігурай у гэтым канфлікце фашысцкіх груповак, якія супернічаюць паміж сабой. Габінэт яго — габінэт кампрамісу — і ён мае па сутнасьці самастойнага палітычнага твару. У ім мала буйных палітычных фігур. І ў гэтым габінэце пераважаюць сэйюкайцы, якім прадстаўлены ў прыватнасьці важнейшыя пасьля прэм'ера пасты міністра ўнутраных спраў і міністра фінансаў.

Аднак, ні Сузукі, ні Токанамі, ні Кухара не ўвайшлі ва ўрад і прадстаўлены ў ім толькі сваімі прыхільнікамі. Таксама стаіць справа з Мінсэйтаўскай часткаю габінэту, якая палкам прадастаўлена другарадныні фігурамі. Сам Саіто карыстаецца хутчэй, адносна гаворачы, ліберальнай рэпутацыяй і яго сувязі з фашызмам, вельмі шадаўнага паходжаньня. Цікава, што Саіто зьяўляецца з 1929 г. старшынёю япона - савецкага таварыства і ў поўным сэнсе пераемнікам барона Гота, які зьяўляецца актыўным прыхільнікам умацаваньня прыязных япона-савецкіх адносін.

Буйнейшай фігурай у габінэце застаецца пры створаных умовах Аракі, які захаваў пост вайсковага міністра, які ён займаў у папярэднім ураде. У сваім апошнім інтэрв'ю Аракі зноў падкрэсьліў цэнтральны тэзіс ваенна-фашысцкай прапаганды: надзвычайную небясьпеку становішча, неабходнасьць «перш за ўсё патушыць палаючы навукола пажар, неабходнасьць, у імя выратаваньня Японіі паклясьці канец становішчу, калі «частковыя інтарэсы становяцца перашкодай на шляху арміі і флёту». Тон гэтага выступленьня наглядна паказаў, што вайсковыя колы маюць намер і ў далейшым разьвіваць узмоцненую палітычную актыўнасьць.

Кампрамісны, прамежны характар новага японскага ўраду прымушае яго быць вельмі асьцярожным у фармуляваньні сваёй праграмы. Апублікаваньне ўрадавай дэкларацыі адкладзена да адкрыцьця парляманцкай сэсіі. Можна, аднак, загадзя прадбачыць, што дэкларацыя гэта працугледзіць умацаваньне інфляцыйных тэндэнцый папярэдняга ўраду, а таксама завастрэньне наступальнай палітыкі ў адносінах Манчжурыі. Што датычыць славутай «дапамогі сельскай гаспадарцы», якая фігуруе зараз у плянформах усіх японскіх буржуазна-памешчыцкіх груповак, то яна на справе зьвядзецца да дапамогі банкам, якія нясуць страты на абесцаненьні нерухомае маемасьці, і памешчыкам і ліхвярам, тады, калі становішча ўшчэнт зруйнаванага сялянства ні на ёту не палепшыцца.

Неакрэсьленая палітычная фізіяномія новага японскага габінэту і асабістая рэпутацыя яго кіраўніка не зьмяняюць таго факту, што апошнія падзеі ў палітычным жыцьці Японіі знамянуюць далейшы посьпехі ў справе фашызацыі краіны. Уплыў армейскіх колаў узрос, курс на адкрыты захват Манчжурыі ўмацаваўся. Гэтыя акалічнасьці адыгрываюць рашаючую ролю для ацэнкі далейшых перспэктыў разьвіцьця японскай палітыкі.

Ліквідацыя ТБШ і беларускага школьніцтва ў Зах. Беларусі—крок наперад да інтэрвэнцыі

ЯЙМІН ГАНЬБЛЮ ПОЛЬСКІХ АКУПАНТАЎ І ІХ ПРЫХВАСНЯЎ—БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТАЎ

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРАТЭСТУ СТУДЭНТАЎ КАМУНІСТЫЧНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ БЕЛАРУСІ ІМЯ ЛЕНІНА

Мы, студэнты Камуністычнага Універсытэту Беларусі імя Леніна, заслухаўшы даклад т. Бурсэвіча аб падрыхтоўцы польскім фашызмам ліквідацыі Зах. Беларусі Таварыства Беларускай Школы і беларускіх гімназій у Вільні і Навагрудку,—вельмі абураны пратэстуем супроць гэтага самым рашучым чынам.

Апошнія весткі аб забароне зьезду ТБШ, ліквідацыі гурткоў Т-ва ясна сьведчаць, што акупантам не ўдалося фашызаваць гэтую беларускую арганізацыю нацыянальна-вызваленчага руху, не ўдалося яе перадаць беларускому нацыянал-фашызму, каб стварыць з яе гнілое беларускай контр-рэвалюцыі для барацьбы з нацыянальна-вызваленчым рухам і атуманьваньня працоўных мас. Цяпер, фашысцкі ўрад, пачаў бязупынны рост нацыянальна-вызваленчага руху, які пад кіраўніцтвам сталёвай КПЗБ усё больш і больш, нарашчае канчаткова ліквідаваць гэту культурна-асьветную арганізацыю — Таварыства Беларускае школы.

Ліквідацыя ТБШ і беларускага школьніцтва на Зах. Беларусі пры актыўнай дапамозе прысьпешнікаў беларускага нацыянал - фашызму — Астроўскага, Луцкевіча і К° — гэта адзін з фактаў падрыхтоўкі да ўзброенага нападу на СССР. Каб ачысьціць тыл і падрыхтаваць плацдарм для ваенных дзеяньняў супроць СССР, польскія імпэрыялісты душаць асаблівa на Зах. Беларусі і Зах. Украіне рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух, ліквідуюць яго арганізацыі і школьніцтва прычнечаных народаў.

У той час як у нас, у БССР і СССР, з кожным годам растуць дзесяткі і сотні ўсё новых і новых навучальных устаноў, у Зах. Беларусі, якая знаходзіцца пад ярмом беларапольскіх акупантаў, ліквідуюцца апошнія школы як беларускія, так і літоўскія, і яўрэйскія.

Мы, чырвонае студэнцтва Камуністычнага універсытэту імя Леніна, у адказ крывавым фашысцкім катам, подлым патромнічкам нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных мас Зах. Беларусі, яшчэ больш узмацнім клясавую пільнасьць і будзем прыкладаць усе сілы на ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР, на будаўніцтва сацыялістычай бясклясавай краіны.

Прэч крывавыя рукі ад нацыянальна-вызваленчага руху, ТБШ і беларускага школьніцтва!

Далоў акупантаў Зах. Беларусі.

Далоў крывавы фашысцкі тэрор!

Далоў здрадзікаў і правакатараў працоўных мас — беларускіх нацыянал-фашыстаў Астроўскага, Луцкевіча і К°!

Дамагаемся вызваленьня з турмаў лепшых барацьбітоў за вызваленьне Зах. Беларусі з-пад акупацыі т.т. Тарашкевіча, Валошына, Крычыка, Гаўрылка, Дварчаніна і ўсіх палітзьняволеных рабочых і сялян.

Няхай жыве і магутнее нацыянальна-вызваленчы рух працоўных мас Зах. Беларусі!

Няхай жыве КПЗБ — правадыр нацыянальна-вызваленчага руху!

ЗА МЯЖОЙ

Залпы па сялянскім мітынгу

ВАРШАВА, 6. (ТАСС). 5 чэрвеня адбыліся крывавыя сутычкі сялян з паліцыяй у воласьці Лабунь, павету Бохня (Кракаўскага ваяводзтва). У гэтай воласьці ўчора адбыўся сялянскі мітынг, у якім прыняло ўдзел некалькі соцень чалавек. Паліцыя прабавала разганяць удзельнікаў мітынгу, якія аказалі супраціўленьне паліцыі і закідалі яе каменьнямі. Паліцыя дала залп, у рэзультаце чаго 2 сялян было забіта і 5 паранена.

Напады беспрацоўных на цягнікі з вугалем

ВАРШАВА, 6. (ТАСС). «Ілюстраваны курэр цодзенны» прыводзіць паведамленьне аб новым нападзе беспрацоўных на вугальныя цягнікі. Паміж станцыямі Петракоў і Бабы (Лодзінскае ваяводзтва) беспрацоўныя ў колькасьці ня менш 250 чалавек напалі на таварны цягнік, які вёз вугаль, і пачалі скідваць вугаль на палатно чыгункі. Ня дзячы на ружэйны залп, даны паліцыяй, беспрацоўныя ахоўвай цягніка, беспрацоўныя ўсё-ж працягвалі скідваць вугаль. Ружэйнымі выстрэламі паранена некалькі беспрацоўных, адзін з іх — цяжка. Вельмі характэрным зьяўляецца тое, што на той-жа самы цягнік у дарозе быў зроблен другі напад яшчэ больш вялікага натоўпу беспрацоўных паміж станцыямі Код і Ракіціна. «Ілюстраваны Курэр цодзенны» паведамляе, што ў сувязі з частымі выпадкамі нападу на вугальныя цягнікі, улада прадпрыняла рад мер па ўзмацненьні аховы вугальных цягнікоў.

Бурнае выступленьне гарнякоў на капальні Мысловіцэ

ВАРШАВА, 4. (ТАСС). Адначасова з дэманстрацыямі польскіх беспрацоўных патрабуючых выдачы дапамог, адзначаецца рост масавых выступленьняў рабочых на прадпрыемствах Верхняй Сілезіі і Дамброўскага басэйну, выкліканых сыстэматычным затрыманьнем і зьніжаньнем зарплаты. З прычыны гэтага становішча занятых рабочых, якія ў большасьці выпадкаў працуюць толькі 2-3 дні ў тыдзень, у спалучанасьці амаль шчыма не адрозьніваецца ад распачлівага становішча беспрацоўных. Сёньня газэты паведамляюць, што на капальні Мысловіцэ (Верхняя Сілезія) мела месца бурнае выступленьне гарнякоў, выкліканае затрыманьнем зарплаты.

Адзіным чырвоным фронтам супроць фашызму

З адозвы ЦК германскай кампартыі

БЭРЛІН, 5. ЦК кампартыі Германіі вярнуўся з наступнай адозвай да рабочай клясы і ўсіх працоўных Германіі: «Дзякуючы сацыял-дэмакратычным выслужнікам рэакцыі, дыктатура надзвычайных дэкрэтаў Брюнінга-Брэўнінга-Шлейхера прыняла да ўраду юнкераў, генералаў і капітанаў прамысловасьці. Капіталістычная безгаспадарчасьць і вэрсальскае прыгнечаньне зруйнавалі Германію. Калі працоўныя Германіі хочуць жыць — павінен зьнікнуць капіталістычны хаос. Па прадпісаньні трох год пануючыя клясы агра- і на 30 млрд. марак працоўных Германіі.

Эксплёататары, аднак, не задавольваюцца гэтым рабункам. Яны хочуць яшчэ больш узмацніць галечу і жабрацтва мас. Для ўраду Папэна капіталістычная падатковая палітыка, якая давялася да гэтага часу, азначае ўзмацненьне ўзяў на ўзмацненьне ўзяў. Для ўраду Папэна капіталістычная палітыка, якая давялася да гэтага часу, азначае ўзмацненьне ўзяў на ўзмацненьне ўзяў. Для ўраду Папэна капіталістычная палітыка, якая давялася да гэтага часу, азначае ўзмацненьне ўзяў на ўзмацненьне ўзяў.